Дзядзька Мікола

ІТАЛЬЯНСКА-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК

DIZIONARIO ITALIANO-BELARUSSO

Прадмова,

якая амаль непатрэбна ў такім маленечкім слоўніку.

Дружа,

Хто ўмее ўжываць чатырыста замежных слоў, той не заблудзіцца і не застанецца галодным у чужым краі.

Хто ўмее карыстацца тысячай чужых слоў, той здолее падтрымаць разумную гутарку.

Хто ведае чатыры тысячы слоў, той будзе цікавым суразмоўцам.

Хто захоча ўмець чытаць чужынскі падручнік гісторыі, фізікі ці біялогіі, таму спатрэбіцца каля васьмі тысяч слоў.

А далей - болей, пакуль якая-небудзь еўрапейская мова не стане тваёй прыладай здабывання зьвестак, ведаў, а чытанне на ёй - прыемным бавеннем часу.

(У гэтым слоўніку каля пяці з паловай тысяч італьянскіх слоў. Але веданне значэнняў марфалагічных элементаў- суфіксаў і прыставак- дазваляе дадаткова вызначыць значэнне багата якіх слоў.)

От для пачатку такога шляхетнага працэсу я і зрабіў гэткі невялічкі слоўнік.

Той, хто вывучае італьянскую мову, заўважыць суб’ектыўную прыгажосць абедзьвюх моў- італьянскай і беларускай. Тры найпрыгажэйшыя мовы Еўропы- гэта валійская, італьянская і беларуская. Магчыма, гэта для беларускага вуха. Але тое, што мелодыка і гучанне гэтых моў нам асабліва прыемнае - гэта так. .

Маладым беларусам надзвычай важнае хоць бы і невялікае, але ўпэўненае валоданне еўрапейскімі мовамі для здабывання ведаў і асабістых кантактаў. Вось чаму такія невялічкія слоўнічкі могуць быць тым ключыкам, што адчыняе вялікую браму.

Несумненна, той, хто хоць збольшага вывучыць італьянскую мову, міжволі вывучыць яе добра, бо яна сама цягне цікаўнага чалавека за сабою.

Студэнту ж веданне любой заходняй мовы надзвычай карыснае.

Слоўнік без прыкладаў ужывання слоў падаецца мне нуднаватым, таму я пастараўся ашчадна праілюстраваць яго невялічкімі ўзорамі-перакладамі.

Рады быць карысным,

Дзядзька Мікола, складальнік слоўнічка.

Першага сакавіка 2015г.

P.S. Хоць я дбайна прагледаў, і не раз!, слоўнік, усё ж дробныя недагляды непазьбежныя. Прашу прабачэння за іх і спадзяюся, што гэта не прынясе карыстальніку ладных нязручнасьцей.

ТЛУМАЧЭННІ ДА ЎЖЫВАННЯ СЛОЎНІКА.

Пры рэестравых італьянскіх словах прыведзены іхнія найважнейшыя беларускія адпаведнікі. Вядома, часта акрамя пададзеных, існуюць і іншыя значэнні і сэнсы слоў.

Рэестравыя словы ў слоўніку разьмешчаныя ў алфавітным парадку. Назоўнікі пададзены ў адзіночным ліку, прыметнік, калі ён двух родаў, - у адз. л. мужчынскага роду.

Амографы падаюцца паасобна.

riso I *m* (*plf* risa) сьмех

riso II *m* рыс

Пры італьянскіх словах пазначана граматычная катэгорыя пераходнасьці ***vt*** /непераходнасьці ***vi***. Зваротныя дзеясловы маюць займенік **si;** як правіла, яны непераходныя

preparare *vt* рыхтаваць; ***p.rsi*** рыхтавацца

Калі слова выступае ў розных катэгорыях, то кожная катэгорыя пазначаецца асобна.

urgente *1agg* пільны, тэрміновы; *2avv* пільна, тэрмінова

Назоўнікі і прыметнікі на –**co**, **-go** якія ў множным ліку мяняюць гук [к] на [ч], а [г] на [дж] маюць ля сябе пазнаку (-ci), (-gi)

Назоўнікі і прыметнікі на –**co** і –**go** якія ў множным ліку захоўваць гэтыя гукі і пішуцца -**chi**, -**ghi**, за рэдкім выняткам не маюць аніякіх пазнак.

Ілюстрацыі да слова выдзелены напаўтлустым курсіўным шрыфтам. Рэстравае слова падаецца першай літарай

scàrica *f* залп; разрад; ***s. elèttrica*** электрычны разрад (*трэ чытаць **scàrica elèttrica***)

Калі ў ілюстрацыі слова пададзена ў множным ліку, то ілюстраванае слова падаецца першай літарай, а канчатак **a** ці **o** пададзены як **e** ці **i**.

prova *f* доказ; выпрабаванне; ***…non avere p.e*** не мець доказаў (*трэ чытаць **non avere prove***)

Пры некаторых дзеясловах і прыметніках у дужках пададзена кіраванне.

accòrgersi (di) заўважаць, ...

condito *1agg* (con) прыпраўлены (*чым-н.*)

Пры дзеясловах III спражэння ў дужках пазначана ўстаўка -***sc***-: **unire** (-sc-) …

Два дзесяткі найважнейшых дзеясловаў (andare… volere) праспраганыя ў корпусе слоўніка ў цяперашнім часе абвеснага ладу.

Нажаль, ладная колькасць "няправільных" дзеясловаў змусіла мяне адмовіцца ад уключэння табліцы іхніх парадыгмаў у слоўнічак. Яны проста пазначаныя зорачкай*****, дапр**.*stravòlgere** Такія дзеясловы і іх формы трэба шукаць у граматыках і большых слоўніках. Зрэшты, пры цяперашняй павальнай інтарнетызацыі няма праблем знайсьці спражэнне любога дзеяслова, набраўшы ў гуглі што-небудзь кшталту **verbi italiani** ці сам дзеяслоў і пабачыць поўную парадыгму спражэння.

Слоўнічак маленькі, таму пры ім няма іньшых звычайных дадаткаў: геаграфічных назваў, сьпісу імён, скаротаў і пад. Такія звесткі пры неабходнасьці можна знайсьці ў іньшых крыніцах.

Неабходны мінімум граматычных зьвестак знаходзіцца у дадатку да слоўніка.

Італьянскія скароты, ужытыя ў слоўніку:

agg aggettivo прыметнік
avv avverbio прыслоўе
cong congiunzione злучнік
escl esclamazione выклічнік
f femminile назоўнік жаночага роду
fpl femminile plurale назоўнік жаночара роду множнага ліку
invar незмяняльнае слова
m maschile назоўнік мужчынскага роду
mpl maschile plurale назоўнік мужчынскага роду множнага ліку
num card nùmero cardinale колькасны лічэбнік
num ord nùmero ordinale парадкавы лічэбнік
pl plurale множны лік
pp participio passato дзеепрыметнік мінулага часу
prep preposizione прыназоўнік
pron pronome займеннік
sg singolare адзіночны лік
vi verbo intransitivo непераходны дзеяслоў
vt verbo transitivo пераходны дзеяслоў

a A

a *prep* (*перад словам, што пачынаецца з галоснай можа мець форму* ad) да, на, у; ***acqua al ginocchio*** вада па калена
abbagliare *vt* асьляпляць; падманьваць
abbaiare *vi* брахаць, гаўкаць
abbandonare *vt* пакідаць; ***a.rsi al dolce farniente*** цешыцца гуляннем
abbassare *vt* апускаць, паніжаць; ***a.rsi*** апускацца, прыгнуцца
abasso далоў!
abbastanza *avv* даволі, дастаткова
abbàttere *vt* зваліць, скінуць
abbellire (-sc-) *vt* упрыгожваць
abbigliamento *m* вопратка, адзежа
abbonamento *m* падпіска, абанемент
abbonarsi падпісвацца
abbondante *agg* раскошны, багаты
abbondanza *f* шматлікасць, багацце, мноства
abbordàbile *agg* дасяжны; ***i prezzi sono molto più a.li*** цэны куды больш дасяжныя
abbottonare *vt* заплікаць
abbracciare *vt* абдымаць
abbraccio *m* абдымак, абдыманне
abbreviazione *f* скарачэнне, скарот
abbronzante *agg* які спрыяе загару; ***olio a***. алей для загару
abbronzarsi загарэць
abbronzatura *f* загар
abete *m* елка
àbile *agg* спрытны, умелы, здольны
abilità *f* здольнасць
abitante *m* жыхар, насельнік
abitare *vi*, *vt* жыць
abitato *agg* (da) населены
abitazione *f* кватэра
àbito *m* касцюм, вопратка
abituare *vt* (a) прывучаць; прышчапляць; ***a.rsi*** прывыкаць, прызвычайвацца
abituato *agg* (a) які прывык, звычны
abitùdine *f* прывычка, звычай
abolire (-sc-) *vt* скасаваць
abusare *vi* (di) злоўжываць; гвалціць
abusivo *agg* незаконны, супрацьзаконны
abuso *m* злоўжыванне
***accadère** *vt* здарацца
accamparsi усталяваць лагер
accanto *avv* (a) побач (з)
accarezzare *vt* лашчыць
accattivante *agg* чароўны
accèdere** *vi* пагаджацца; ***a. a мець доступ да
accelerare *vt* паскараць
accèndere** *vt* запаліць; уключыць; ***a. il televisore уключыць тэлевізар; ***a. il fuoco*** запаліць агонь; распаліць вогнішча
accendino *m* запальнічка
accenno *m* кіў, знак галавою; намёк
accentuare *vt* акцэнтаваць, падкрэсьліваць, выдзяляць
accerchiamento *m* акружэнне, атачэнне
acceso I *1agg* запалены; *2pp да* accèndere
accessìbile *agg* дасяжны, даступны
accesso II *m* уваход; доступ
accessorio *m* прылада, рыштунак; дэталь
accettare *vt* прымаць; дапускаць; ухваляць
acciaccato *agg* скамечаны, пакамечаны
acciaio *m* сталь
accidentale *agg* выпадковы, ненаўмысны; другасны, неістотны
accidente *m* выпадак, здарэнне; ***a.ti!*** *escl* халера ясная!; данежне!
accoglienza *f* прыём; ***trovare una calda a***. сустрэць цёплы прыём
***accógliere** *vt* прымаць, сустракаць
accolto *1agg* прыняты; *2pp да* accògliere
***accògliere** *vt* прымаць, сустракаць
accomodarsi уладкоўвацца; сядаць
accompagnare *vt* праводзіць, суправаджаць

acconsentire *vt* пагаджацца
accontentare *vt* задаволіць, дагадзіць
accordo *m* згода, дамова, пагадненне; ***d`a.*** згода!; ***èssere d'a.*** пагаджацца
***accorgersene** заўважаць (*што-н.*)
accòrgersi** (di) заўважаць, здагадвацца, убачыць; ***a. di avere molta fame раптам адчуць страшэнны голад
accorso *1agg* заўважаны; *2pp да* accòrgere
accorto *agg* праніклівы, прадбачлівы; ***èssere più a***. быць болей здагадлівым
accostare *vt* наблізіць, падсунуць, прыставіць
accumulare *vt* запасіць; зьбіраць
accusa *f* абвінавачанне
accusare *vt* вінаваціць
aceto *m* воцат
àcido *1m* кіслата; *2agg* кіслы
acqua *f* вада
acquarello *m* акварэль
acquazzone *m* лівень
acquistare *vt* набываць, купляць
acquisto *m* набытак, пакупка
acrobazìa *f* акрабатызм
acuto *agg* востры; рэзкі
ad = a
adagio *avv* ціха, павольна
adattare *vt* прыстасоўваць; прыладжваць
adatto *agg* прыдатны; ***a. a*** + *inf* прыстасаваны да + *наз*.
addetto *m* аташэ
addio *m* разьвітанне; ***a.!*** бывайце!
addirittua *avv* неадкладна, адразу, прама
addormentarsi засынаць
addossarsi ускінуць на сябе, браць на сябе
addosso *avv* на сабе, на плячах; з сабою
aderente *agg* які прыліпае, прылягае; у абліпку (*пра вопратку*)
aderire (-sc-) *vi* прылягаць, прыліпаць, прыставаць; далучацца, уступаць
adesivo *agg* клейкі, ліпкі
adesso *avv* зараз, цяпер
adocchiare *vt* разглядаць, выглядаць
adolescente *1agg* юны, падлеткавы; *2m* падлетак
adolescenziale *agg* падлеткавы
adoràbile *agg* чароўны, любімы
adorare *vt* моцна любіць, захапляцца
adottare *vt* прымаць, ухваляць; усынаўляць
adulto *agg*, *m* дарослы
aereo *1agg* паветраны; *2m* самалёт
aeròbica *f* аэробіка
aeroplanino *m* самалёцік; ***a. di carta*** самалёцік з паперы, папяровы самалёцік
aeroplano *m* самалёт
aerospaziale *agg* авіякасьмічны; ***ingegneria a***. авіяпрамысловасць
afa *f* спёка, задуха
affàbile *agg* ветлы, ласкавы
affaciarsi высоўвацца, выглядаць з
affamato *agg* галодны, змарнелы з голаду
affare *m* справа, праца; ***a. fatto!*** дамовіліся!
affascinante *agg* чароўны, захапляльны
affascinare *vt* зачараваць, заваражыць
affaticato *agg* стомлены
affatto *avv* зусім, цалкам; ***non mi importa a. di come*** мне зусім няважна як...
affermare *vt* сцвярджаць; замацоўваць
affermativo *agg* сцьвярджальны
affermazione *f* сцвярджэнне, пацверджанне
affetto *m* пачуццё, любасць
affettuoso *agg* прыязны, прыветны
affezionarsi пасябраваць, прывязацца
affezionato *agg* (a) прывязаны; прызвычаены да
affidare *vt* давяраць, даручаць

***affiggere** *vt* павесіць (*абвестку, плакат*)
affinchè *cong* каб
affinità *f* блізкасць, роднаснасць
affisso *1agg* прымацаваны, павешаны; *2pp да* affiggere
affittare *vt* арандаваць, аддаваць/ браць у найм
affitto *m* найм, арэнда; арэндная плата; плата за кватэру
affluire (-sc-) *vi* сьцякацца, зьбірацца
affondare *vt* апускаць на дно, затапляць; тапіць
affrescare *vt* расьпісваць фрэскамі
affresco *m* фрэска
affrettarsi пасьпяшацца
affrontare *vt* выстаяць, супраціўляцца
aforisma *m* афарызм
agente *m* агент, пасрэднік; рэчыва
agganciare *vt* прычапіць
aggeggio *m* дробязь
aggettivo *m* прыметнік
aggiornato *agg* абноўлены, папоўнены; /*пра тэрмін*/ прызначаны; ***èssere a. su*** быць прызначаным на
aggiudicarsi здабыць, заваяваць (*месца*)
aggiùngere** *vt* дадаваць; ***a.rsi дадацца
aggiustare *vt* ладзіць, рапараваць; ***a. la radio*** паладзіць радыё
aggressione *f* агрэсія, напад
aggressivo *agg* агрэсіўны
àgile *agg* увішны, вёрткі
agire (-sc-) *vi* дзейнічаць, рабіць, чыніць
agitare *vt* махаць; хваляваць; боўтаць, трэсці
agitato *agg* усхваляваны, неспакойны
agli = a + gli
aglio *m* часнок
agnellino *m* ягнятка
agnello *m* ягня
ago *m* (*pl* aghi) іголка
agonìstico (*pl* -ci) *agg* спартыўны; ***stagione a.a*** спартыўны сезон
agostano *agg* жнівеньскі
agosto *m* жнівень
agrìcolo *agg* земляробчы, сельскагаспадарчы
agricoltore *m* зямляроб, хлебароб
agricoltura *f* земляробства
agrumi *mpl* цытрусавыя
ai = a + i
aiutare *vt* дапамагаць
aiuto *m* дапамога; ***a., N***! памажы, N!
al = a + il
ala *f* (*mpl* ali, *fpl* ale) (*у розных сэнсах*) крыло; плаўнік
alato *agg* крылаты
alba *f* зара, досьвітак; ***all`a.*** на досьвітку
albergo *m* атэль; прытулак
àlbero *m* дрэва; мачта; ***a. maestro*** грот-мачта
albicocca *f* абрыкос /*плод*/
albicocco (*pl* -cchi) *m* абрыкосавае дрэва
alce *m* лось
alcuno *pron* ніякі (*у адмоўных сказах*)
aleggiare *vi* паволі махаць крыллем, лунаць; веяць (*пра вецер*)
alieno *agg* чужы; неахвочы; далёкі ад
alimentare *1vt* карміць; сілкаваць; *2agg* харчовы
alimentazione *f* харчаванне, ежа; сілкаванне
**all`** = a + l`
alla = a + la
allagamento *m* паводка
allargare *vt* пашырыць
allarmante *agg* трывожны, які выклікае непакой
allarmare *vt* непакоіць, трывожыць
allarme *m* трывога, неспакой, сігнал трывогі; ***dare***/ ***lanciare l'a***. узьняць трывогу; ***il sistema d`a***. сістэма сігналізацыі
alle = a + le
alleanza *f* пагадненне, саюз
alleato *1agg* саюзны; *2m* саюзнік
allegramente *avv* весела

allegrare *vt* радаваць; ***a.rsi*** радавацца, цешыцца
allegrìa *f* весялосць
allegro *agg* вясёлы, бадзёры
allenamento *m* трэніроўка
allenare *vt* трэніраваць; ***a.rsi*** трэніравацца
allenatore *m* трэнер
allergìa *f* алергія
allestire (-sc-) *vt* рыхтаваць
allettante *agg* прывабны
allevamento *m* гадаванне, гадоўля
alligatore *m* алігатар
allineare *vt* разьмяшчаць, расстаўляць, выраўноўваць
allineati *agg* расстаўленыя
allo = a + lo
alloggio *m* жыллё, кватэра
allontanare *vt* аддаляць; ухіляць; адсунуць; ***a.rsi*** аддаляцца, адыходзіць
allora *avv* тады, у такім разе; ***da a***. з таго часу, з тае пары; ***di a***. тагачасны
allungare *vt* падаўжаць, выцягваць ***a. un braccio*** падаць руку
almeno *avv* прынамсі
alpeggio *m* альпійскі луг, паша
altalena *f* арэлі
alternativa *f* чаргаванне; альтэрнатыва; ***mèttere di fronte all'a***. паставіць перад выбарам
altezza *f* вышыня; вяршыня; рост
altitùdine *f* вышыня (*над роўнем мора*)
altipiano *m* пласкагор'е
alto *1agg* высокі; значны; позні; гучны; *2avv* высока, угары; гучна; *3m* вышыня; верх; ***salire in a***. узьняцца, праславіцца
altrettanto *avv* столькі ж
altrimenti *avv* інакш; а то
altro *agg* іньшы, другі; ***le a.e volte*** тыя разы; ***a.i... a.i***... адны… другія
altronde, **d`a**. *avv* адтуль, адкуль-небудзь; зрэшты, з іньшага боку
altrove *avv* у іньшым месцы
alzabandiera *m* узьняцце сьцягу
alzare *vt* узьнімаць, падымаць; ***alzate un piede***! падыміце нагу!; ***a.rsi*** падымацца, уставаць (*і ад сну*)
amante *1agg* які любіць; *2m* аматар, палюбоўнік; ***sono un a. di*** я люблю
amare *vt* любіць, кахаць; жадаць
amarezza *f* горыч; горкі смак
amaro *agg* горкі
ambasciata *f* пасольства; пасланне
ambasciatore *m* пасол
ambedue *agg, pron* абедзьве, абодва
ambiente *m* атачэнне, асяродак; ***a. naturale*** навакольны асяродак
ambiguo *agg* двухсэнсоўны, сумнеўны; дваісты
àmbito *m* абшар, сфера; ***nell'à. di*** у рамках *чаго-н.*
ambizione *f* ганарыстасць; памкненне
ambulante *agg* вандроўны; ***venditrice a***. вандроўная гандлярка
ambulanza *f* хуткая дапамога (*машына*)
amica *f* сяброўка
amichèvole *agg* сяброўскі
amicizia *f* сяброўства, дружба
amico (*pl* -ci) *m* сябар
ammalarsi захварэць
ammanettato *agg* у кайданках
ammazzare *vt* забіваць
ammesso *agg* дапушчаны, прыняты
***amméttere** *vt* дапускаць, дазваляць; пагаджацца
amministrativo *agg* адміністратыўны
ammiraglio *m* адмірал
ammirare *vt* зьдзіўляцца, дзівіцца; захапляцца
amnistia *f* амністыя
amo *m* кручок (*рыбалоўны*)
amore *m* каханне, любасць, любоў
amoroso *agg* які кахае, палюбоўны
ampio *agg* шырокі, прасторны
amplificarsi павелічацца
anàlisi *f* аналіз
analizzare *vt* аналізаваць
anche *avv* таксама, акрамя таго, яшчэ
ancora *avv* яшчэ, зноў, усё яшчэ
andamento *m* ход, разьвіццё

andare** *vi* (vado, vai, va, andiamo, andate, vanno) хадзіць існці, езьдзіць, дзейнічаць; ***come vanno le lezioni? як ідуць заняткі; ***andiamo*** хадзем/це; паехалі! ***andiamo a sentire***... хадзем паслухаем; ***lasciare a.*** адпусьціць; ***a.rsene*** пайсьці, адыйсці
anello *m* пярсьцёнак
àngelo *m* анёл
àngolo *m* кут, вугал; рог (*вуліцы*)
angoscia *f* смутак, маркота, неспакой
anguilla *f* вугор
angustia *f* нястача; трывога, непакой
ànima *f* душа
animale *1agg* жывёльны; *2m* жывёліна
animare *vt* ажыўляць, удыхаць жыццё
animazione *f* ажыўленне, ажыўленасць
animo *m* дух; бадзёрасць; думка
anniversario *m* гадавіна
annegare *vt* затапіць; ***a.rsi*** утапіцца
anno *m* год; ***l'a. scolàstico*** навучальны год; ***gli a.i passano anche per me*** і мяне гады не абмінаюць; ***per dieci anni*** на дзесяць год
annoiare *vt* надакучваць, назаляць; ***a. senza scampo*** страшэнна абрыдаць; ***a.rsi*** сумаваць
annotare *vi* адзначаць, запісваць
annuale *agg* штогадовы
annunciare *vt* абвяшчаць, паведамляць
annuncio *m* вестка, абвестка
annusare *vt* нюхаць, абнюхаць; вынюхаць, празнаць
anónimo *agg* ананімны, безымянны
ansa *f* ручка, дужка; затока
ansioso *agg* неспакойны; трывожны; які прагне, які імкнецца
antàrtico *agg* антарктычны
antefatto *m* папярэдняя падзея
antenato *m* продак
antenna *f* антэна; ***a. parabólica*** парабалічная/ спадарожнікавая антэна
anteriore *agg* папярэдні
antichità *f* старажытнасць; антыкварыят
anticipare *vt* выконваць /рабіць дачасна; ***a. il tempo/ i tempi*** апярэджваць час
anticipato *agg* дачасны, папярэдні
anticipo *m* апярэджанне; ***con qualche giorno di a***. за некалькі дзён да
antico *agg* старажытны, антычны
antipático (*pl* -ci) *agg* антыпатычны, непрыемны
antishock *agg*: ***il casco a.*** засьцерагальная каска
anzi *1avv* наадварот, нават, больш за тое; *2prep* раней, даўней; *3cong* ***a. che*** замест таго каб
anziano *1agg* пажылы; *2m* стары
anziché *cong* замест таго каб
anzitutto *avv* найперш
ape *f* пчала
aperto *1agg* адчынены; *2pp да* aprire
apertura *f* адтуліна, дзірка; ***l'a. alare*** размах крыла/ў
appalto *m* падрад, заказ; ***vìncere l`a***. выйграць падрад/ заказ
apparecchiato *agg* /*стол*/ прыгатаваны, сабраны
apparecchio *m* прылада, прыстасаванне; ***a. radio*** радыёпрымач
apparenza *f* бачнасць, падабенства; зьнешнасць
***apparire** (-sc-) *vi* зьяўляцца
appartamento *m* кватэра
***appartenere** *vi* належаць, уваходзіць склад
appassionato *1agg* палкі, заўзяты; *2m* аматар; ***èssere a. di*** надта захапляцца, вельмі ўпадабаць
appena *avv* ледзь, толькі што; ***non a***. як толькі, ледзь толькі
appetito *m* апетыт
appetitoso *agg* апетытны, смачны
applicare *vt* прыкладаць, наносіць
appoggiare *vt* падтрымліваць, дапамагаць; падпіраць
appoggio *m* падпора; апора, падтрымка

appositamente *avv* наўмысна
appósito *agg* прыдатны, дарэчны; адмысловы
apposta *avv* наўмысна
appresso *1prep* каля, блізу, побач; *2avv* пазьней, пасьля
apprezzare *vt* цаніць
approfittare *vi* (di) карыстацца, скарыстаць
approfondire *vt* паглыбляць
approvare *vt* ухваліць
appuntamento *m* спатканне
appunto *avv* менавіта, як раз, дакладна
aprile *m* красавік
aprire** *vt* адчыняць, адмыкаць; адкрываць; ***a. la strada пракласьці дарогу
áquila *f* арол
àrabo *1m* араб; *2agg* арабскі
araldo *m* вяшчун
arancia *f* апельсін
aratro *m* плуг
arbitro *m* суддзя, арбітр
arbusto *m* куст
arcano *agg* таемны
archeológico (*pl* -ci) *agg* археалагічны
archeólogo *m* археолаг
architetto *m* дойлід, архітэктар
architettónico (*pl* -ci) *agg* архітэктурны
architettura *f* архітэктура, дойлідства
arco *m* дуга, выгін; лук; арка
arcobaleno *m* вясёлка
area *f* плошча; зона, раён; пляцоўка; ***a. protetta*** забароненая зона, запаведнік
argento *m* срэбра
argilla *f* гліна
àrgine *m* дамба, насып, плаціна
argomento *m* аргумент, довад; зьмест, сюжэт
aria I *f* паветра; ***all`a. aperta*** на вольным паветры, пад адкрытым небам
aria II *f* выгляд, зьнешнасць, выраз твару
ariete *m* баран, таран
arma *f* зброя
armadio *m* шафа
armamento *m* зброя, узбраенне
armare узбройваць
aromatizzato *agg* араматызаваны
arrabiarsi злавацца, шалець; раздражняцца
arrabiato *agg* у шаленстве, раз'юшаны, раззлаваны
arrampicarsi узлазіць, залезьці; ***a. sul tetto***/ ***su un álbero*** залезьці на страху/ на дрэва
arrampicata *f* стромкі пад'ём, цяжкае ўзыходжанне
arredamento *m* рыштунак; ***rovinare l`a.*** сапсаваць рыштунак/ абсталяванне
arrendersi здавацца, капітуляваць; ***mi arrendo!*** здаюся!
arrestare *vt* спыняць, затрымліваць; арыштаваць
arresto *m* затрыманне, арышт; затрымка, спыненне
arretrare *vt* адступаць, адыходзіць; ***a. di un passo*** адступаць на крок
arrichire *vt* узбагачаць; ***a.rsi*** багацець
arrivare *vi* (a) прыязджаць, прыходзіць; дасягаць; даставаць да; падыходзіць; ***ci sto arrivando*** я да гэтага падыходжу; ***a. sul posto*** прыязджаць у гэтую мясціну
arrivederci *escl* бывайце! да сустрэчы!
arrivo *m* прыбыццё, прыезд, прыход
arrostire (-sc-) *vt* смажыць, пражыць
arrostito *agg* смажаны
arrosto *m* смажаніна
arrovellarsi біцца; ***a. a sui libri*** гарбець над сваімі кнігамі
arsenale *m* арсенал; склад зброі
arso *agg* пражаны; спалены; ***fu a. al rogo*** быў спалены на вогнішчы
arte *f* мастацтва; майстэрства
àrtico *agg* арктычны, паўночны
artícolo *m* артыкль; артыкул; выраб

artificiale *agg* штучны
artificio *m*, **artifizio** *m* прытворства, хітрасць
artigiano *m* рамеснік
artiglieria *f* артылерыя
artista *m*, *f* артыст, -ка
artístico (*pl* -ci) *agg* мастацкі
ascella *f* падпаха
ascensore *m* ліфт
asciugamano *m* уціральнік, ручнік
asciugare *vt* выціраць
asciutto *agg* сухі, не мокры
ascoltare *vt* слухаць; ***ascolta!*** паслухай!
asilo *m* прытулак; сховішча
asino *m* асёл
aspettare *vt* чакаць; ***farsi a***. забавіцца, змусіць сябе чакаць; ***non ti fare a***. не баўся
aspetto *m* чаканне; від, выгляд; аспект
aspirapólvere *m invar* пыласос
aspirare *vi* імкнуцца
aspirazione *f* імкненне, памкненне
asportare *vt* пераносіць, перавозіць
aspro *agg* кіслы
assaggiare *vt* каштаваць, смакаваць, паспытаць
assaggio *m* выпрабаванне; каштаванне, смакаванне
assai *1avv* даволі, дастаткова; *2agg* багата хто, многія
***assalire** *vt* нападаць; накідацца
assassinare *vt* забіваць
assassino *m* забойца
asse I *f* дошка
asse II *m* вось; ***a. orizzontale***/ ***verticale*** гарызантальная/ вертыкальная вось
assecondare *vt* садзейнічаць, спрыяць
assediare *vt* абкладаць; тоўпіцца вакол
assedio *m* аблога; ***lo stato d`a***. асаднае становішча
assemblea *f* сход, асамблея
assente *agg* адсутны
assenza *f* адсутнасць
assetato *agg* сасмаглы, які прагне; ***a. di vendetta*** які прагне помсты
assicurare *vt* запэўніваць; забясьпечыць, гарантаваць; страхаваць
assicurazione *f* запэўненне; страхаванне
assiduità *f* старанне, стараннасць; ***con maggiore a***. старанней, з большым стараннем
assieme *avv* разам, гуртам
assistenza *f* прысутнасць; дапамога; догляд; ***a. domiciliare*** догляд дома
***assístere** *vi* спрыяць; прысутнічаць; даглядаць (*хворага*)
associazione *f* асацыяцыя, суполка, аб’яднанне
assolto *1agg* вызвалены, адпушчаны; *2pp да* assòlvere
assolutamente *avv* абсалютна, безумоўна
assoluto *agg* абсалютны, неабмежаваны; безумоўны
***assòlvere** *vt* адпусціць, вызваліць
assomigliarsi *vt* (a) быць падобным да
assorbente *m* абсарбент, паглынальнік; ***a. igiènico*** гігіенічная падкладка
assordante *agg* аглушальны
***assúmere** *vt* браць на сябе (*адказнасць*); прымаць; набываць (*памеры, размах*)
assunto *m* абавязацельства, задача
assurdo *agg* недарэчны, абсурдны
astrale *agg* зорны
astratto *agg* адцягнены, абстрактны
astro *m прам. пер*. зорка, сьвяціла
astrología *f* астралогія
astronave *f* касьмічны карабель
astronomía *f* астраномія
astrónomo *m* астраном
astuto *agg* хітры, каварны
ateo *m* атэіст, бязбожнік
atleta *m* атлет, спартовец
atmosfera *f* атмасфера
atómico *agg* атамны
àtomo *m* атам
atroce *agg* жорсткі, люты

atrocità *f* жорсткасць, лютасць
attacare *vt* далучаць, прымацоўваць; нападаць
attacato *agg* прымацаваны, прывязаны
attacco *m* напад, атака; прыступ, прыпадак
attegiamento *m* стаўленне, падыход
***attèndere** *vt* чакаць; браць пад увагу
attentato *m* замах
attento *agg* уважлівы; паслужлівы; ***a.!*** зважай!
attenzione *f* увага; ***fare piú a***. надаваць болей увагі
atterraggio *m* прызямленне; ***a. di fortuna*** змушаная пасадка
atterrare *vi* прызямляцца, садзіцца
attesa *f* чаканне; ***per ingannare l`a***. каб забавіць час
áttimo *m* імгненне, момант
attività *f* чыннасць, дзейнасць
atto *m* учынак, справа, акт, дзея
attore *m* актор, артыст; дзейная асоба
attorno *1avv* навокал, кругом; *2prep* ***a. a*** вакол, каля
***attrarre** *vt* прыцягваць; вабіць
attraversare *vt* пераходзіць, перасякаць, працінаць
attraverso *1avv* упоперак, наўскасяк; *2prep* праз, скрозь
attrazione *f* прывабнасць, цяга
attrezzatura *f* аснашчэнне, абсталяванне; начынне, рыштунак
attrezzo *m* прылада, прыстасаванне, рыштунак
attribuire (-sc-) *vt* прыпісваць /*аўтарства*/
attrice *f* актрыса, артыстка
attricetta *f* актрыска
attuale *agg* цяперашні
attualità *f* рэчаіснасць; актуальнасць
audace *agg* сьмелы, адважны
audacia *f* сьмеласць, адвага
augurare *vt* прадказваць; віншаваць
augurio *m* прадказанне; віншаванне; ***tanti auguri!*** шчыра віншую
aumentare *vt* расьці; падвышаць
aumento *m* павелічэнне, рост
auricolare *m* слухаўка; ***a.i*** слухаўкі
auscultare *vt* выслухаць (*хворага*)
ausiliare *agg* дапаможны
auto *m* аўтамабіль; ***finire sotto un`a.*** трапіць пад машыну
autoambulanza *f* санітарны аўтамабіль, хуткая дапамога
autografo *m* аўтограф; ***concèdere a***. даць аўтограф
automático (*pl* -ci) *agg* аўтаматычны
autonomìa *f* аўтаномія, самакіраванне
autonominarsi выдаваць сябе за
autore *m* аўтар
autorèvole *agg* аўтарытэтны
autorità *f* улада
autoritario *agg* аўтарытарны, уладарны
autorizzare *vt* дазваляць; упаўнаважваць
autorizzazione *f* дазвол; паўнамоцтвы
autrice *f* аўтарка
autunnale *agg* асенні
autunno *m* восень
ava *f* бабуля, баба
avanguardia *f* авангард
avanti *1avv* раней, дагэтуль; паперадзе, наперад; ***più a***. далей, ніжэй (*у тэксьце*); *2prep* перад; *3escl* наперад!
avanzare *1vt* рухаць наперад, прасоўваць; вылучаць; выперадзіць, абагнаць; *2vi* рухацца наперад, прасоўвацца
***avere** *1vt* (*спраж. ў ц. часе* ho, hai, ha, abbiamo, avete, hanno) мець, валодаць; (*дапаможны дзеяслоў для ўтварэння мінулых часоў пераходных дзеясловаў*); *2m* маёмасць
aviazione *f* авіяцыя
avifauna *f* птушынае царства, авіфаўна
avvelenamento *m* атручанне
avvelenare *vt* атруіць
avvelenato *agg* атручаны; ***èssere a.*** быць атручаным
avvenimento *m* падзея, здарэнне

***avvenire** *vi* адбывацца, праходзіць; здарыцца
avventura *f* прыгода
avventuriero *m* прайдзісьвет, авантурыст
avverbio *m* прыслоўе
avversario *m* праціўнік, вораг
avversità *f* нягода, няшчасьце, цяжкасць
avvertenza *f* перасцярога, папярэджанне; асцярожнасць
avvertire *vt* папярэджваць, перасьцерагаць; заўважаць, адчуваць
avviare *vt* прыводзіць у рух, заводзіць, запускаць; пачынаць
avvicinarsi набліжацца, падыходзіць
avvincente *agg* захапляльны, цікавы
avvocato *m* адвакат
***avvòlgere** *vt* захутаць, абгарнуць, закруціць
azienda *f* гаспадарка; прадпрыемства
azionare *vi* прыводзіць у дзеянне, запускаць, уключаць
azione *f* дзеянне; учынак; узьдзеянне
azzardarsi рызыкаваць, асьмеліваццa
azzardato *agg* рызыкоўны
azzuro (**azzurro**) *agg* блакітны, сіні

b B

babbo *m* тата
bacchetta *f* палачка, шпень; ***b. màgica*** чароўная плачка
baciare *vt* цалаваць
bacio *m* пацалунак
badare *1vt* даглядаць жывёлу; вартаваць; 2*vi* зважаць; асьцерагацца
badile *m* рыдлёўка, залязьняк
baffo *m* вус
bagaglio *m* багаж
bagnare *vt* мачыць; купаць; ***b.rsi*** купацца
bagnato *agg* мокры
bagno *m* ванна; лазьня; ***avere bisogno di andare al b.*** мець патрэбу памыцца
balcone *m* балкон
balena *f* кіт (*жывёла*)
baleno *m* маланка; ***in un b.*** умомант
balía *f* улада; панаванне
bàlía *f* карміцелька; ***fare da b***. быць карміцелькаю
balla *f* пак, скрутак, рулон; ***b. di fieno*** рулон сена
ballare *vi*, *vt* скакаць, танцаваць
ballerina *f* балерына; ***infaticabile b.*** нястомная танцорка
ballerino *m* танцор
balletto *m* балет
ballo *m* скокі, танец; баль
balzare *vt* скакаць, падскокваць
balzo *m* скачок
bambina *f* дзяўчынка
bambino *m* дзіця, немаўля; хлопчык
bàmbola *f* лялька
banalità *f* банальнасць
banca *f* банк
bancario *agg* банкаўскі; банкірскі
banchetto *f* банкет
banco *m* лава; прылавак; станок
banda *f* край, бок; банда
bandiera *f* сьцяг
baobab *m* баабаб
bara *f* труна, дамавіна
barba *f* барада
barbabiètola *f* бурак
barbagianni *m invar* пугач
barbarie *f* варварства
barca *f* лодка, човен; ***b. a vela*** парусная лодка
barchetta *f* лодка
barella *f* насілкі
barista *m* бармэн
barriera *f* бар'ер, перашкода; ***una b. insormontabile*** неадольная перашкода; ***oltrepassare una b.*** пераадолець перашкоду
barzelletta *f* анекдот, жарт, досьціп
base *f* аснова, падмурак; база
baseball *m* бейзбол
basílica *f* базіліка; збор, сабор
basso *1agg* нізкі, невысокі; *2avv* нізка; ціха, нягучна; *3m* бас
bassorilievo *m* барэльеф

basta *escl* годзе! досыць!
bastare *vi* хапаць, быць дастатковым
battaglia *f* бітва
battello *m* лодка, невялікае судна
báttere *1vt* біць, стукаць; *2vi* біць /*пра гадзіннік*/
battuta *f* удар; такт
bau *escl* гаў; ***bau bau*** гаў-гаў; ***il bau bau*** брэх, гаўканне
baule *m* куфар
be' I *agg скарот да* bei
be' II *avv скарот да* bene; ну, ладна
becco *m* дзюба; рот; носік, кончык
bei = belli
bel = bello
bellezza *f* прыгажосць, хараство
bellíssimo *agg* надзвычай прыгожы
bello *agg* /*у формах м.р. перад назоўнікам мае формы* bel, bello, bell`, bei, begli/ прыгожы, цудоўны, добры
belva *f* звер; ***b. feroce*** люты звер
ben: ***ben ti sta, zio!*** так табе і трэба!
benchè *cong* хоць, нягледзячы на тое, што
bene I *avv* добра; ***va b.!*** добра!; ***e va b***. добра!; ***starai subito b***. ты хутка ачуняеш; ***va b. cosi?*** так добра?; ***ben b.*** добра, пільна
bene II *m* дабро
beneficio m карысць, выгода
benèssere *m* дабрабыт
benna *f* коўш /*экскаватара*/
bensì *cong* вядома ж, праўда
benvenuto *m, escl* сардэчна запрашаем! ***date il b***. лічы, што ты дома
benzina *f* бензін
***bere** *vt* (bevo, bevi,beve,beviamo, bevete, bevono) піць
bersaglio *m* мішэнь; ***colpire il b***. патрапіць/ пацэліць у мішэнь
bestia *f* жывёліна, скаціна, худоба
bestiale *agg* жывёльны, зьвярыны
bestiame *m* жывёла, худоба
bevanda *f* напой
bevitore *m* п'яніца; піток; ***b. di sangue*** крывасмок
biancheria *f* бялізна
bianco *agg* белы, чысты
bibita *f* напой
biblioteca *f* бібліятэка
bicentenario *m* двухсотгоддзе
bicchiere *m* шклянка, келіх
bici *f,* **bicicletta** *f* веласіпед
bieco *agg* косы, непрыязны
bicicletta *f* веласіпед
bielorusso *1agg* беларускі; *2m* беларус
bigliettino *m* запісачка; білецік
biglietto *m* білет; запіска; ***b. di andata e ritorno*** білет туды і назад
bilanciato *agg* ураўнаважаны
bilancio *m* каштарыс, бюджэт; баланс
bimba *f* дзяўчо
binócolo *m* бінокль; ***con un b***. праз бінокль
biodegradábile *agg* біялагічна разбуральны; ***materiale b***. біялагічна разбуральны матэрыял
biología *f* біялогія
bionda *f* бялявая, бландзінка
biondo *agg* бялявы
birra *f* піва
bisbético (*pl* -ci) *agg* капрызны; дзіўны
bisognare *1vi* мець патрэбу, бракаваць; *2impers* быць патрэбным, быць неабходным; ***bisogna*** трэба
bisogno *m* справа, праца; патрэба, неабходнасць; ***aver b. di*** мець патрэбу ў
bisognoso *agg* бедны; ***b. di qualche soldo*** без шэлега
bizantino *agg* візантыйскі
bloccare *vt* блакаваць; спыніць
bloccato *agg* заблакаваны; ***èssere b***. быць заблакаваным
blù *agg* сіні
bocca *f* рот; пашча; ***tenere la b. chiusa*** маўчаць, трымаць язык за зубамі
boccale *m* карэц; збан
boccone *m* кавалак; глыток; ***b. di pane*** кавалак хлеба
bollettino *m* бюлетэнь; талон
bollire *vi* кіпець

bollito *agg* /*пра ваду*/ пераварaны; звараны; ***finire b***. зварыцца
bomba *f* бомба, граната
bombardamento *m* бамбардаванне, абстрэл
bombardare *vt* бамбіць; абстрэльваць
bómbola *f* пузатая пасудзіна; балон; ***b. d`ossigeno*** кісларoдны балон
bontà *f* дабрата
borbottio *m* бесперапыннае мармытанне, бесперапынная буркатня
bordo *m* борт; бераг***; a b.*** на борце; ***sul b. del laghetto*** на краі возера
borgata *f* пасёлак; ускраінны квартал (*у Рыме*)
borghese *1agg* буржуазны; цывільны; ***agente in b***. паліцыянт у цывільным; *2m* буржуа
borsa *f* торба; кашалёк; біржа; ***b. nera*** чорны рынак
borsellino *m* торбачка; кашалёк
bosco *m* лес
bottega *f* лаўка, крама
bottiglia *f* бутэлька, пляшка
botto *m* удар; стрэл
bottone *m* гузік
braccetto *m*: ***andare a b. con***ісьці пад руку з
braccio *m* рука; (*pl* le braccia); ***tendere le b.a*** абдымаць
brama *f* прага, моцнае жаданне
brandello *m* шматок, кавалак (*тканіны*); ***b.i*** лахманы
bravo *agg* выдатны, цудоўны; чэсны; сьмелы, адважны
breve *agg* кароткі, непрацяглы
brevíssimo *agg sup* надзвычай кароткі; ***tra b***. вельмі хуценька
brillante *agg* бліскучы, блішчасты
brìvido *m* дрыжыкі, дрыготка
brodo *m* поліўка, булён
brontolare *vi* бурчаць, муркаць
bruciare *1vt* паліць, абпальваць; *2vi* гарэць
bruno *agg* карычневы; ***camicie b.e*** карычневыя кашулі /*нацысты*/
brutale *agg* жывёльны, скацінны; жорсткі, брутальны
brutto *agg* непрыгожы, брыдкі, паганы
buca *f* яма; дзірка; магіла**; *b. delle lèttere*** *f* паштовая скрынка
bucato *agg* дзіравы, цяклівы
bue *m* вол, бык
buffo *agg* сьмешны, камічны
bugía *f* хлусьня, мана
bugiardo *1agg* ілжывы; *2m* хлус, манюка
buio *1agg* цёмны; *2m* цемра, змрок
bulldozer *m* (*pl* i bulldozer) бульдозер
bullo *m* хуліган; ***fare il b***. хуліганіць
buon = buono *перад наз. м. р.*
buonanotte *escl* дабранач!
buonasera *escl* добры вечар!
buongiorno *escl* добры дзень!
buono *agg* добры, чэсны, сардэчны; ***di buon ora*** рана
burattino *m* лялька, марыянетка
burro *m* масла
burrone *m* строма, абрыў; ***spìngere giù nel b***. скінуць/ спіхнуць са стромы
bussare *1vi* стукаць; *2vt* біць
bùssola *f* компас
busta *f* канверт
buttare *vt* кідаць, выкідаць; ***b. via*** выкідаць вон, выкінуць прэч

c C

caccia *f* паляванне; ***dare la c. a*** паляваць на
cacciare *1vi* паляваць; *2vi* гнаць; кідаць; ***c. nei guai*** патрапіць у бяду
cacciatore *m* паляўнічы, мысьлівец
cadàvere *m* труп
cadere** *vi* падаць, упасьці; ***c. giù падаць уніз, валіцца; ***c. per*/ *a terra*** падаць на зямлю
caduta *f* падзенне, ападанне
caduto I *1agg* які ўпаў; *2m* забіты; ***monumento ai caduti*** помнік загінутым
caffè *m* кава; ***fare il c***. зварыць каву

calare *1vt* апускаць, спускаць; *2vi* апускацца, спускацца; ***cala la notte su*** ноч апускаецца на
calcagno *m* пята
calciatore *m* футбаліст
calcio *m* насцак, высьпятак; футбол
calcistico (*pl* -ci) *agg* футбольны
calcolare *vt* вылічаць; абдумваць, узважваць
caldo *1agg* цёплы, гарачы; *2m* сьпёка
calma *f* зацішша; спакой; ***c.!*** спакойна!
calmare *vt* супакойваць***; c.rsi*** сьціхаць, супакойвацца
calmata *f* зацішша; ***dare una c.*** супакоіць
calmo *agg* спакойны, ціхі
calo *m* зьмяншэнне; ***èssere in c.*** зьмяншацца
calore *m* цеплыня, цяпло
calza *f* панчоха, шкарпэтка; *fpl* ***calze*** панчохі
calzare *vt* абуваць
calzino *m* шкарпэтак; ***c.i bucati*** падраныя шкарпэткі
calzo *m* абутак
calzoni *mpl* штаны
camaleonte *m* хамелеон
cambiamento *m* перамена
cambiare *1vt* мяняць, замяняць; *2vi* мяняцца, змяняцца
cambio *m* абмен, замена; ***in c. di*** замест, у замен
camera *f* пакой; камера; палата /*парламенту*/; ***c. da letto*** спальня
cameretta *f* пакойчык
cameriere *m* афіцыянт
camicetta *f* кофта; майка /*лідэра* /
camicia *f* кашуля; абгортка; ***c. nera*** фашыст (*італьянскі*)
caminetto *m* комінак, камін
camino *m* комін
camminare *vi* ісьці, крочыць, шпацыраваць
cammino *m* шлях, дарога
camoscio *m* замша
campagna *f* поле; сельская мясцовасць, вёска; кампанія
campana *f* звон; шкляны каўпак
campanello *m* званок
campanile *m* званіца
campeggio *m* турыстычны лагер; месца для лагеру
campione *m* чэмпіён
campionessa *f* чэмпіёнка; ***c. di salto in lungo*** чэмпіёнка па скачках у даўжыню
campo *m* поле, ніва; пляцоўка; ***c. di concentramento*** канцлагер
camposanto *m* могілкі
can *m* хан
canadese *1agg* канадскі; *2m* канадзец
canale *m* канал
cancellare *vt* закрэсліваць, выкрэсьліваць; адмяняць, скасаваць
cancelliere *m* канцлер
cancello *m* дзьверы, вароты
cancro *m* рак (*хвароба*)
cane *m* сабака
cannochiale *m* пад’зорная труба
cannone *m* гармата
cannuccia *f* трубачка; піпка
canoa *f* лодка, байдарка
cantante *m, f* спявак, спявачка
cantare *vi*, *vt* сьпяваць, апяваць
canto I *m* сьпеў, сьпевы
canto II *m* кут, рог; бок; ***d’altro c.*** з іньшага боку; ***dal c. mio/ tuo*** з іньшага боку; што тычыцца мяне/ цябе
canzone *f* песьня
caòtico (*pl* -ci) *agg* бязладны, хаатычны
capace *agg* здольны, умелы; ёмісты
capacità *f* здольнасць; ёмістасць; ***c. di lavoro*** працаздольнасць
capanna *f* хаціна
capeggiare *vt* узначальваць, ачольваць
capeggiato *agg* узначалены, ачолены
capello *m* волас; ***la ragazza dai lunghi c.i*** дзяўчына з доўгімі валасамі
capiente *agg* зьмяшчальны
capire (-sc-) *1vt* разумець; *2vi* зьмяшчацца, улазіць
capitale I *agg* асноўны, галоўны

capitale II *1m* капітал; *2f* сталіца
capitano *m* капітан
capitare *vi* зьяўляцца; здарацца; ***c. di vedere*** удавацца ўбачыць
capito *1agg* зразумелы; ***c.!*** зразумела!; *2pp да* capire
capìtolo *m* разьдзел (*кнігі*)
capo *m* галава; верхавода; начальнік; ***c.!*** шэф!; ***da c***. ад пачатку
capofitto: ***a c***. *avv* уніз галавою
capolavoro *m* шэдэўр
***capovòlgere** *vt* перакуліць, перавярнуць
cappella *f* капліца
cappello *m* капялюш
capìtolo *m* раздзел (*кнігі, дакументу*)
capo *m* начальнік, шэф; галава
capofitto: ***a c***. уніз галавою
cappella *f* капліца
cappotto *m* паліто
capra *f* каза
capriolo *m* касуля /*самец*/
caprone *m* казёл
cara *agg*, *f* дарагая, любая
carabinière *m* карабінер, жандар
caràttere *m* характар
caratterìstica *f* асаблівасць, характэрная рыса
carbone *m* вугаль
carburante *m* паліва; ***fare provvista di c***. заправіцца палівам
càrcere *m* турма
cardiaco *agg* сардэчны; ***per un attacco c***. ад сардэчнага прыпадку
cardiopático (*pl* -ci) *m* хворы на сэрца
carezza *f* ласка, пяшчота
cárica *f* пасада; зарад; атака; ***rimanere in c***. застацца пры пасадзе
caricare *vt* грузіць; зараджаць; заводзіць; ***c.il grammofono*** заводзіць грамафон
càrico *1agg* нагружаны; *2m* груз
carie *f* карыес
carino *agg* прыгожы, любы
carne *f* мяса; цела, плоць
carnìvoro *agg* мясаедны, драпежны
caro *agg* дарагі, любы; дарагі, нятанны
carota *m* морква
carrello *m* каляска, калясачка; павозка
carriola *f* тачка
carro *m* калёсы; вагон; ***c. armato*** танк
carrozza *f* карэта, каляска; вагон
carta *f* папера; аркуш; дакумант; хартыя; карта /*і для гульні*/; ***c. da gioco*** ігральная карта; ***c. e penna*** папера і ручка; ***c. igiènica*** гігіенічная папера
cartellino *m* этыкетка, картка; ***c. rosso*** чырвоная картка /*знак спагнання*/
cartoleria *f* крама канцылярскіх тавараў
cartolina *f* паштоўка
cartone *m* кардон; ***c.i animati*** мультыплікацыя
casa *f* хата, дом; фірма
casalinga *f* хатняя гаспадыня
cascata *f* вадаспад; ***c. sotterranea*** пад'земны вадаспад
caschetto *m* кепка
casco *m* каска, шлём; ***il c. antishok*** засьцерагальная каска
casella *f* скрыначка; клетачка; ***c. postale*** паштовая скрынка
casetta *f* хаціна
casino *m* хаціна; казіно; гармідар, бязладдзе
caso *m* выпадак, здарэнне; справа; ***per c.*** выпадкам, выпадкова, часам
cassa *f* скрынка; каса
cassaforte *f* (*pl* casseforti) сейф
casseruola *f* каструля (*звыч. з ручкай*)
cassetta *f* скрынка, скрыначка
cassetto *m* шуфляда
castello *m* замак, цьвярдыня; вежа
catapultare *vt* катапультаваць
catarifrangente *agg* святлаадбівальны; ***le strisce c.i*** святлаадбівальныя палоскі
catàstrofe *f* катастрофа
categorìa *f* катэгорыя, група

catena *f* ланцуг, канвеер; шэраг; ***c. dei grandi magazzini*** сетка універмагаў; ***c. alimentare*** харчовы ланцуг
catino *m* міса
cattedrale *f* сабор
cattiveria *f* злосць; нізкасць
cattivo *agg* паганы, кепскі, дрэнны; ліхі
cattólico (*pl* -ci) *1agg* каталіцкі; *2m* каталік
cattura *f* арышт, затрыманне; захоп
catturare *vt* затрымліваць, захапіць арыштоўваць; злавіць /*рыбу*/
causa *f* прычына; справа; ***a c. di*** з-за, з прычыны
causare *vt* спрычыняць, выклікаць
cauzione *f* паручыцельства; заклад
cava *f* пячора
cavallo *m* конь
cavare *vt* капаць
cavetto *m* шнур, тросік
cavo I *m* провад, кабель, трос; ***c.i elettrici*** электрычныя правады
cavo II *agg* пусты; дуплаваты; ***albero c***. дуплаватае дрэва
càvolo *m* капуста; ***c.!*** халера ясная!
cd *m* кампакт-дыск
ce *pron. pers* нас, нам
ce *avv* там, туды
c`è** (*pl* ci sono; *мін. час* ***c`era*; ***c`erano***) ёсць, існуе; ***N. non c`è più*** N. болей няма (*г. зн. памёр*)
***cèdere** *vi* паддацца, саступіць; не вытрымаць, рухнуць, зламацца
celare *vt* хаваць, таіць
celebrare *vt* спраўляць, святкаваць; ***c. le nozze*** спраўляць вяселле
cèlebre *agg* славуты
celeste *agg* нябесны; ***corpo c***. нябеснае цела
célibe *1agg* нежанаты; *2m* нежанаты, халасьцяк /*толькі пра мужчыну*/
cellula *f* клетка, ячэйка
cellulare *agg* клеткавы; ***telefono c.*** сотавы/ мабільны тэлефон
céltico (-ci) *agg* кельцкі
cemento *m* цэмент; бетон
cena *f* вячэра ***é ora di c***. час вячэраць
cenare *vi* вячэраць
cènere *f* попел
Ceneréntola *f* Папялушка
cenno *m* знак, намёк
centimetro *m* сантыметр
centinaio *m* (*pl* centinaia) сотня; ***c.a di miglaia*** сотні тысяч
cento *num. card*. сто
centrale *agg* цэнтральны
centro *m* цэнт/а/р, асяродак
ceppo *m* пень, цурбак; калодка
ceràmica *f* кераміка
cercare *1vi* шукаць; *2vt* імкнуцца, намагацца
cerchio *m* круг, акружнасць; абруч ***quadratura del c.*** квадратура кругу; ***trovarsi dentro ad un normale c***. быць у нармальным асяродку
certezza *f* упэўненасць, перакананне
certificare *vt* засьведчыць
certo *1agg* упэўнены; несумненны; нейкі; *2avv* напэўна, вядома; *3pron*: ***un c***. нейкі, пэўны, нехта
certuno *pron. indef, agg*. некаторы; (*pl* certuni) некаторыя
cervello *m* мозг; розум
cervo *m* алень
cespuglio *m* кусты, карчы; ***in mezzo ai c.i*** у кустах
cessare *1vt* спыняць, пераставаць; *2vi* канчацца, спыняцца
cestino *m* кошык; сьметніца для паперы
cesto *m* кошык
cetriolo *m* агурок
che I *1pron. relat*. які, што; *2pron.interr*. што?; *3agg dimostr*. які? каторы? што за?
che II *cong* што; каб; няхай, хай
chi *1pron invar* той, той хто; *2interr* хто? ***chi puo èssere?*** хто гэта можа быць?
chiacchierare *vi* размаўляць; балбатаць
chiacchierata *f* размова, гутарка
chiamare *vt* гукаць, клікаць, называць; ***c.rsi*** называцца, іменавацца

chiamata *f* выклік; сігнал выкліку; ***c. telefònica*** тэлефанаванне
chiarezza *f* празрыстасць, чысьціня; яснасць
chiaro *agg* ясны, чысты; зразумелы
chiasso *m* гоман, шум
chiave *f* ключ
chiédere** *vt* прасіць, патрабаваць; ***c.rsi думаць
chiesa *f* царква, сьвятыня
chilogrammo *m* кілаграм
chilometro *m* кіламетр
chìmica *f* хімія
chìmico (*pl* -ci) *agg* хімічны
chiodo *m* гвозд, цьвік
chioma *f* густыя валасы
chiosco (*pl* -chi) *m* кіёск
chirurgo *m* хірург
chissà *escl* магчыма, хто ведае, напэўна
chitarra *f* гітара
chiúdere** *vt* зачыняць, замыкаць; канчаць; ***c.rsi in se stesso замкнуцца ў сабе
chiunque *pron indef. invar*. хто б то ні быў, уся/ля/кі, любы
chiuso *1agg* зачынены, замкнёны; *2pp да* chiudere
chiusura *f* закрыццё; заканчэнне
ci *pron pers* (*перад* lo, la, li, ne *мае форму* ce) нам, нас, пра нас; ***ci siamo!*** вось мы і прышлі!; (*у формах зваротных безасаб. дзеясл. замяняе* si) ***ci si potrà incontrare*** можна будзе сустрэцца
ci *avv* тут, там, туды: ***c'è*** ёсць; ***c'era*** быў, была, было; ***c'era una volta un re*** жыў-быў цар
cianfrusaglia *f* дробязь, цацка
ciao *escl* бывай!; прывітанне!
ciascuno *agg* кожны, усялякі
cibaria *f* ежа, харчы
cibo *m* ежа, страва
ciclàbile *agg* для веласіпеднай язды; ***una pista c.*** дарожка для веласіпедаў
ciclismo *m* веласпорт
ciclista *m* веласіпедыст
cicloturismo *m* велатурызм
cicogna *f* бусел
cieco (*pl* -chi) *agg* сьляпы, невідушчы
cielo *m* неба
cifra *f* лічба
ciglio *m* (*fp* ciglia, *mpl* cigli) край (*ямы, дарогі*) павейка; брыво
cigno *m* лебедзь
cilecca *f* кпіна; падман, хітрасць
cima *f* вяршыня; шчык; ***sulla c. della collina*** на вяршыні пагорка
cimentare *vt* выпрабоўваць; ***c.rsi con*** памерацца сілаю з
cimitero *m* могілкі
cìnema *m* кіно; ***c. muto*** нямое кіно
cinematogràfico (*pl* -ci) *agg* кінематаграфічны
cinguettio *m* шчэбет; балбатня
cinquanta *num card* пяцьдзесят
cinque *num card* пяць; пяты
cinquecento *num. card*. пяцьсот
cintura *f* папруга, рэмень; талія; ***c. di sicurezza*** рэмень/ пас бясьпекі
cio *pron* гэта
cioccolata *f* шакалад
cioè *cong* то бо
cipolla *f* цыбуля
circa *avv* прыблізна, каля
circo *m* цырк
circolare *vi* рухацца; распаўсюджвацца
circolazione *f* аварачэнне, рух; распаўсюджанне
cìrcolo *m* круг
circondare *vt* акружаць, атачаць
circondato *agg* акружаны; ***èssere c. da*** быць акружаным *чым-н.*
circostanza *f* акалічнасць
città *f* горад
cittadinanza *f* грамадзянства; ***prèndere la c. italiana*** зяць італьянскае грамадзянства
cittadino *1m* грамадзянін; гараджанін; *2agg* гарадзкі
civile *agg* цывільны; цывілізаваны; грамадзянскі; ***diritti c.i*** грамадзянскія правы
civiltà *f* культура, цывілізацыя
clamoroso *agg* гучны, шумны

clandestino *agg* таемны, сакрэтны; пад’земны, падпольны
classe *f* клас
classìfica *f* клас, катэгорыя
clavìcola *f* ключыца
cliccare *vt* пстрыкаць (*кампутарнай мышкай*)
clientela *f* кліентура
clima *m* клімат
climàtico (*pl* -ci) *agg* кліматычны
climatizzatore *m* кандыцыянер
clìnica *f* клініка, лякарня
coagolare *vt* зьяднаць, аб’яднаць; ***c. le forze*** згуртаваць сілы
coalizione *f* аб’яднанне, кааліцыя
coalizzarsi аб’яднацца
cobalto *m* кобальт
cocchio *m* карэта, павозка
coccodrillo *m* кракадзіл
coda *f* хвост; чарга; канец; ***in c***. у канцы
codesto *pron* той
còdice *m* код, ключ; ***il c. d’accesso*** пароль, код доступу
***coesìstere** *vi* суіснаваць
***cògliere** *vt* зрываць, браць
cognome *m* прозьвішча
coincidenza *f* супадзенне; састыкаванне (*раскладу руху і пад*.)
***coincìdere** *vi* супадаць
***coinvòlgere** *vt* (con) уцягваць
colabrodo *m* друшляк; ***diventare una sorta di c.*** стаць падобным на друшляк
colazione *f* сьнеданне; ***fare c***. сьнедаць; ***è ora di c.*** час сьнедаць
colei *pron dimostr* яна, тая
colla *f* клей
collaborare *vi* супрацоўнічаць
collaborazione *f* супрацоўніцтва; узаемадзеянне; ***chiedere la c***. прасіць дапамогі
collana *f* кара́лі; нізка, збор (*твораў*)
collega *m* калега; ***egregio c***. шаноўны калега
collegamento *m* сувязь, злучэнне
collegare *1vt* злучаць; *2vi* мець сувязь
collezionare *vt* зьбіраць /*калекцыю*/
collezione *f* калекцыя
collezionista *m* калекцыянер
collina *f* пагорак
collinetta *f* горка
collo *m* шыя; каўнер
collocare *vt* ставіць, разьмяшчаць; уладкоўваць /*на працу*/
colmo *1agg* поўны, поўны як вока; *2m* вяршыня, верх, мяжа
colombo *m* голуб; ***C***. Калумб (*па-нашаму* Голуб, *адкрывальнік Амерыкі*)
colonna *f* калона; стоўп
colonnello *m* палкоўнік
riuscire** (-sc-) *vi* выходзіць, удавацца; магчы, здолець; аказвацца; ***non r. a + *inf* не здолець, не магчы *зрабіць што-н*; ***r. nel suo/ tuo intento*** змагчы, удацца /*ў спробе*/
riva *f* бераг***; in r. al fiume*** на беразе рэчкі
rivale *m* супернік, канкурэнт
rivedere** *vt* зноў пабачыць, зноў сустрэць; перагледзець; ***r. i suoi piani перагледзець свае планы; ***r.rsi*** зноў пабачыцца; ***ci rivedremo*** мы яшчэ ўбачымся
rivelare *vt* адкрыць, раскрыць; выявіць; ***r. il suo amore*** прызнацца ў каханні
rivendicare *vt* патрабаваць; адстойваць, абараняць
rivìncita *f* адваяванне; адплата; рэванш
rivista *f* часопіс; агляд, перагляд
rivisto *agg* = riveduto; *гл.* rivedere
rivìvere *1vi* ажываць, уваскрасаць; *2vt* зноў перажываць; ***far r.*** уваскрэсіць
rivòlgere** *vt* круціць, варочаць; накіроўваць; зьвяртаць (*позірк*); ***r.rsi зьвяртацца; накіроўвацца
rivolta *f* паўстанне, забурэнне
rivoluzionario *1agg* рэвалюцыйны; *2m* рэвалюцыянер
rivoluzione *f* рэвалюцыя
roba *f* рэч, рэчы; асабістыя рэчы
robusto *agg* дужы, моцны, здаровы; трывалы
roccia *f* скала
rogo *m* вогнішча /*для спалення чаго-н.*/
romano *agg* рымскі
romàntico (*pl* -ci) *agg* рамантычны
romanzo *m* раман
romanziere *m* раманіст, аўтар раманаў
rombo *m* ромб
rómpere** *1vt* ламаць, разьбіваць, ірваць; парушаць; *2vi*, ***r.rsi з/ламацца, біцца
rompicapo *m* галаваломка
rondine *f* ластаўка
rosa *f* ружа
rosso *agg* чырвоны; напалены (*да чырвана*)
rosticcerìa *f* (*прыблізна ўстанова кшталту*) кулінарыя
rotolare *vt* каціць; скручваць, згортваць
ròtolo *m* скрутак; рулон, шпуля
rotondo *agg* круглы
rotto *1agg* зламаны, разьбіты; *2pp да* rómpere
rottura *f* спыненне; пралом; пералом; разрыў
rovescia *f* левы бок, падыспад; ***contare alla r.*** лічыць наадварот, у зваротным парадку
rovesciare *vt* перакуліць, вывернуць
rovescio *1agg* перакулены, перавернуты; *2m* другі бок, левы бок; ***a r***. наадварот
rovina *f* разбурэнне; заняпад
rovinare *1vi* разбурацца, гінуць; *2vt* разбураць, псаваць
rovistare *vt* (in) корпацца, лазіць
rozzo *agg* грубы
rubare *vt* красьці
rubato *agg* крадзены, украдзены
rubinetto *m* кран (*вадаправодны*)
rubrica *f* рубрыка, разьдзел
rùderi *mpl* руіны
rudimento *m* рудымент; *pl* ***r.i*** начаткі
ruga *f* маршчына; складка
rugby *m* рэгбі
rùggine *f* іржа
rugiada *f* раса
rumore *m* шум, гоман; чутка, пагаласка
ruolo *m* роля; сьпіс, рэестр
ruota *f* кола; дыск, круг
ruotare *1vt* вярцець, круціць; *2vi* вярцецца, аварачацца
ruscello *m* ручай

ruspe *fpl* ланцугі (*трактара*)
russo *1agg* рускі; *2m* рускі, расеец
rùvido *agg* шурпаты; грубы

s S

sàbato *m* субота
sabbia *f* пясок
saccheggiare *vt* рабаваць
sacchettino *m* мяшэчак, торбачка
sacco *m* мяшок, мех; ***un s. di*** мяшок *чаго-н.*
sacerdote *m* сьвятар
sacrificio *m* ахвяра, ахвяраванне; цяжкасць, нягода
sacro *agg* свяшчэнны
sala *f* зала; ***s. cinematogràfica*** кіназала; ***s. d'aspetto*** чакальня
salame *m* каўбаса
salario *m* заработная плата
salato *agg* салёны
saldamente *avv* трывала
saldare I *vt* зварваць; літаваць
saldare II *vt* плаціць (*доўг*); спыняць (*спрэчку*)
saldo *agg* трывалы, моцны; цьвёрды
sale *m* соль; *пер.* соль, досьціп
saliera *f* саляніца*,* сальнічка
***salire** *1vt* (salgo, sali, sale, saliamo, salite, salgono) узьнімацца, узыходзіць; *2vi* узыходзіць (*пра сонца і пад*.)
salmone *m* ласось; сёмга
salsiccia *f* каўбаса
saltare *1v* скакаць, пераскокваць; *2vi* саскокваць, выскокваць; ***far s***. узарваць
salto *m* скачок; ***s. in alto*** /***in lungo*** скачок у вышыню/ даўжыню
salutare I *agg* аздараўленчы, лекавы; ***una s. dormita*** здаровы сон
salutare II *vt* вітаць, кланяцца; разьвітацца
salute *f* здароўе, шчасьце, дабрабыт
saluto *m* прывітанне, вітанне, паклон ***i miei s.i*** прывітанне
salvaguardare *vt* ахоўваць, берагчы
salvaguardia *f* ахова, абарона
salvare *vt* выратаваць, збавіць; ***s.rsi*** уратавацца; ***si salvi chi puo!*** ратуйся, хто можа!
salvezza *f* уратаванне, збавенне
salvìfico (*pl* -ci) *agg* выратавальны, ратаўнічы
salvo *1agg* цэлы; жывы, здаровы; *2prep* апрача, за выняткам
sangue *m* кроў
sano *agg* здаровы; разумны; ***s. e salvo*** жывы і здаровы
santo *agg*, *m* сьвяты
sapere** *vt* (so, sai, sa, sappiamo, sapere, sanno) ведаць, умець; ***come si sa як ведама
sapiente *m* разумны; мудры
sapone *m* мыла
sapore *m* смак; ***4 s.i base*** 4 асноўныя смакі
saporito *agg* смачны
saputello *m* разумнік, усявед
sarto *m* кравец
sasso *m* камень, скала
satèllite *m* спадарожнік
saziare *vt* сыціць; задавальняць; наталяць (*голад, смагу*)
sbadigliare *vi* пазяхаць
sbafare *vt* наядацца за чужы кошт
sbagliare *vi* памыляцца, рабіць памылку; ***s.rsi*** памыляцца; ***ti sbagli*** ты памыляешся; ***se non sbaglio*** калі я не памыляюся; ***s. la strada*** зблытаць вуліцу; ***s. la casa*** патрапіць не ў тую хату
sbaglio *m* памылка
sbalordire (-sc-) *vt* уражваць, агаломшваць
sbarazzarsene вызваліцца (*ад каго-, чаго-н*)
sbarbarsi галіцца
sbarcare *vi* высаджвацца (*на бераг*); выгружаць, разгружаць
sbarra *f* упярочына; засаўка; ***mandare alla s.*** адправіць за краты
sbarrare *vt* загарадзіць, перагарадзіць; ***s. la strada*** перагарадзіць вуліцу

sbàttere *vt* ударацъ, біць, пляскаць; ***s. la testa*** выцяцца галавою
sbocco *m* вусьце /*ракі*/, выйсьце; збыт; рынак працы
sbrigarsi пасьпешліва канчаць, хапацца
sbucciarsi абадраць; ***s. un ginocchio*** абадраць калена
sbuffare *vi* пыхкаць, задыхацца
scacciare *vt* праганяць, выганяць
scacco *m* клетка*(на паперы, тканіне*); *pl* ***s.chi*** шахматы
scadenza *f* тэрмін (*вартасьці, дзеяння*)
***scadére** *vi* канчацца, мінаць /*тэрмін*/; зьмяншацца; прыходзіць у заняпад
scaffale *m* шафа; паліцы (*для кніг*)
scagliare *vt* кідаць, шпурляць
scala *f* лесьвіца, драбіны; шкала
scalare *vt* узлазіць, пералазіць***; s. una montagna*** узыходзіць на гару; ***s. sull' Himalaya*** займацца альпінізмам у Гімалаях
scalatore *m* альпініст, скалалаз
scalciare *vi* (contra) біць нагамі (аб, па)
scaldare *vt* грэць, награваць; ***s.rsi*** грэцца
scambiare *vt* мяняць, мяняцца; ***s. per*** мяняць на; ***s.rsi*** абменьвацца
scambio *m* абмен, мена
scampo *m* збавенне, паратунак***; annoiare senza s.*** страшэнна абрыдаць
scansare *vt* пазьбягаць, ухіляцца; адхіляць, адсоўваць
scappare *vi* уцякаць; вырывацца; падскочыць, хуценька зьбегаць; ***s. di casa*** уцякаць з хаты; ***scappiamo!*** уцякайма!
scarabeo *m* жук, скарабей
scarcerare *vt* выпускаць/ вызваляць з турмы
scàrica *f* залп; разрад; ***s. elèttrica*** электрычны разрад
scaricare *vt* разгружаць, выгружаць; высадзіць; узвальваць
scarpa *f* чаравік; ***le s.e*** чаравікі; ***s.e da tennis*** спартыўныя/ тэнісныя чаравікі
scarpone *m* чаравік (*альпініста*)
scarseggiare *vi* нехапаць, быць недастатковым; не мець
scarso *agg* недастатковы, бедны, убогі
scartare *vt* разгортваць, выймаць з паперы; адхіляць, выбракаваць
scatenato *agg* несамавіты, шалёны
scàtola *m* скрынка, каробка
scatto *m* скачок (*колькасны*); ***di s.*** раптоўна
scattare *1vi* распрамляцца, выцягвацца; *2vt* фатаграфаваць; ***s. una foto*** здымаць фатакартку
scatto *m* распрамленне, расьцягванне; ***porta a s***. складныя дзьверы
scavalcare *1vi* злазіць з каня; *2vt* выцясьняць, займаць чужое месца
scavare *vt* капаць зямлю, рабіць раскопкі
scavato *agg* раскапаны, выкапаны
***scègliere** *vt* (scelgo, scegli, sceglie, scegliamo, scegliete, scelgono) выбіраць, рабіць выбар
scelta *f* выбар, адбор
scelto *1agg* выбраны, абраны; адборны; *2pp да* scègliere
scena *f* сцэна
scenario *m* сцэнар; мясцовасць, пейзаж, улонне
scéndere** *1vt* спускацца; ***s. giú злазіць; ***s. per il camino*** лезьці праз комін; ***s. le scale*** злазіць/ сходзіць па лесьвіцы *2vi* падаць, зьніжацца, зьмяньшацца; ***s. giù dal cielo*** спускацца зь неба
sceneggiato *agg* пастаўлены інсцэнаваны
sceneggiatura *f* сцэнар
sceso *pp да* scèndere
scetticismo *m* скептыцызм
scettico (*pl* -ci) *1agg* скептычны; *2m* скептык
scheda *f* картка, бланк
schema *m* схема, план
schermo *m* экран; заслона

scherzare *vi* жартаваць
scherzetto *m* жарцік
scherzo *m* жарт; ***fare uno s. a*** пажартаваць з
schiacciare *vt* раздушыць, расплюшчыць
schiantare *vt* ламаць, разьбіваць; ***s.rsi contro*** разьбіцца аб
schiatta *f* сям'я, род, племя
schiavitù *f* рабства
schiavo *m* раб
schiena *f* сьпіна, хрыбет
schienale *m* сьпінка /*крэсла*/
schiera *f* шарэнга, шэраг, шыхт
schifo *m* агіда
schiuma *f* пена
sci *m inv* лыжы; ***praticare lo s.*** катацца на лыжах
sciagura *f* бяда, няшчасьце; ***s. aerea*** авіякатастрофа
sciare *vi* катацца на лыжах
sciarpa *f* шалік
sciatore *m* лыжнік
scientìfico (*pl* -ci) *agg* навуковы; ***trasmissione s.a*** навуковая перадача
scienza *f* навука
scienziato *m* навуковец
sciìstico *agg* лыжны; ***stazione s.a*** лыжная база
scimmia *f* малпа
scio! *escl* акыш!
sciocchezza *f* глупства, дурасьць
sciocco *agg* дурны, недарэчны
***sciògliere** *vt* разьвязваць, адвязваць; распускаць
scioglimento *m* адвязванне, развязванне; вырашэнне, разблытанне; роспуск, расфармаванне
sciolto *1agg* разьвязаны; вольны, нязмушаны; *2pp да* sciògliere
scioperare *vi* страйкаваць, баставаць
sciòpero *m* страйк
sciupare *vt* псаваць; мантачыць
scivolare *vi* пасьлізнуцца; ***s. nell'acqua*** пасьлізнуцца ў вадзе; ***s. giù*** скаціцца, спусьціцца, зьехаць (*з горкі*)
scoglio *m* скала, рыф, камень
scolaro *m* школьнік, вучань
scolàstico *agg* школьны; ***l'anno s.*** навучальны год
scollacciato *agg* моцна дэкальтаваны
***scommèttere** *vt* разьяднаць; біцца аб заклад, спрачацца
scòmodo *agg* нязручны; няёмкі
***scomparire** (-sc-) *vi* зьнікаць, прападаць
scomparsa *f* зьнікненне; сьмерць
scomparso *1agg* зьніклы; памерлы; *2pp да* scomparire
scomparto *m* разьдзел; аддзел; купэ
***sconfiggere** *vt* наносіць паразу, перамагаць
sconfitta *f* параза, разгром
sconfitto *1agg* пераможаны; *2pp да* sconfiggere
sconosciuto *agg* невядомы
sconsigliare *vt* адгаварыць, не раіць
sconsolato *agg* несуцешны; ***piàngere s.*** горка плакаць
sconto *m* выплата; скідка
scontrarsi сустракацца; сутыкацца; біцца; ***s. contro*** уступіць у бой з
scontro *m* сутыкненне; сутычка, бой
sconvolgente *agg* сенсацыйны
***sconvòlgere** *vt* узрушваць, хваляваць
sconvolto *1agg* узрушаны, усхваляваны; *2pp да* sconvòlgere
scopa *f* венік, мятла
scoperta *f* адкрыццё, выяўленне
scoperto *1agg* адкрыты, непакрыты; адкрыты, знойдзены; ***lasciare s.*** пакінуць адкрытым; *2pp да* scoprire
scopo *m* мэта
scoppiare *vi* выбухаць, ірвацца; успыхваць /*пра вайну*/; ***s. a rìdere*** зарагатаць
scoppiettante *agg* які трашчыць, траскучы
scoppio *m* выбух
scoprire *vt* адкрываць, раскрываць; знайсьці, убачыць
scoraggiare *vt* палохаць, адпужваць, пазбаўляць сьмеласьці; ***s.rsi*** занепадаць духам, адчайвацца

scordare *vt* забываць
***scòrgere** *vt* убачыць, заўважыць
scorpione *m* скарпіён
scòrrere** *1vi* цячы; ісьці, праходзіць (*пра справы*); *2vt* прабягаць, праглядаць (*тэкст*); ***s. il giornale прагледзець газету
scorso *agg* мінулы***; l'anno s***. летась; ***lo s. anno*** леташні год
scortare *vt* суправаджаць, канваіраваць
scossa *f* штуршок, удар; сутрасенне; ***s. tellùrica*** зямны/ сейсьмічны штуршок
scottare *1vt* апячы, апарыць; *2vi* пячы, смаліць
scottatura *f* апёк
scoutismo *m* скаўтынг
scremato *agg* абястлушчаны; ***latte s***. абястлушчанае малако
scritto *1agg* напісаны; *2pp да* scrìvere
scrittoio *m* пісьмовы стол
scrittore *m* пісьменнік
scrittrice *f* пісьменніца
***scrìvere** *vt* пісаць, напісаць
scrùpolo *m* далікатнасць, сарамлівасць; ***senza s.i*** бессаромна
scudo *m* шчыт; *пер*. абарона
scultore *m* скульптар
scultura *f* скульптура
scuola *f* школа
***scuòtere** *vt* трэсьці, калаціць; узрушваць
scure *f* сякера
scuro *agg* цёмны; незразумелы
scusa *f* апраўданне, выбачэнне; прычына, адгаворка
scusare *vt* выбачаць; ***scusate!*** даруйце! ***s.rsi*** выбачацца; ***s.rsi con*** прасіць прабачэння ў; ***scusateci!*** даруйце нам!
sdraiarsi выцягнуцца, разьлегціся
se I *cong* калі; калі б; ці
se II *partic. pronominale* = si
se III *pron. riflessivo* сябе
sebbene *cong* хоць, нягледзячы на
seccare *vt* сушыць
secco *agg* сухі, сушаны
secolare *1agg* векавы; *2m* міранін
sècolo *m* стагоддзе, век; ***non ne mangio da s.i*** сто год іх не еў
secondario *agg* другасны, другарадны
secondo I *1num. ord*. другі; *2m* секунда
secondo II *1prep*. згодна з, гледзячы па, паводле; ***s. me*** на маю думку; ***s. la mappa*** мяркуючы па карце; *2avv* па-другое; *3cong* ***s. che*** згодна з тым, што, паводле таго, што
sede *f* сядзіба; асяродак
sedentario *agg* сядзячы
sedere** *vi* сядзець; ***s.rsi сядаць
sedia *f* крэсла; ***s. a dondolo*** крэсла-гайдалка
sedicente *agg* самазваны, саманазваны
sedicèsimo *num card* шаснаццаты
sèdici *num. card* шаснаццаць; шаснаццаты
seducente *agg* спакусьлівы, прывабны
seduta *f* паседжанне; сядзенне
seduto *agg* сядзячы; ***èssere s***. сядзець
sega *f* піла
segare *vt* пілаваць
seggiolina *f* крэсла; ***s. a dondolo*** крэсла-гайдалка
segnalare *vt* сігналізаваць, падаваць знак; паведамляць; паказваць
segnale *m* знак; сігнал; ***s. di divieto*** знак забароны (*дарожны*)
segno *m* знак, прыкмета; сьлед; ***s. di divisione*** /***di moltiplicazione*** знак дзялення/ множання
segretaria *f* сакратарка
segretario *m* сакратар
segreto *1agg* сакрэтны; *2m* сакрэт, таямніца
seguente *agg* наступны
seguire *1vt* ісьці, ехаць, трымацца; сачыць, назіраць; *2vi* працягваць; вынікаць; надыходзіць, ісці сьледам; ***seguimi***/ ***seguitemi*** ідзі/ ідзіце за мною
sei *num. card*. шэсць; шосты
seicento *num. card*. шэсцьсот
selciare *vt* брукаваць
selciato *m* брук

selezionare *vt* выбіраць, адбіраць
sella *f* сядло
selvaggio *1agg* дзікі; *2m* дзікун
sembrare *vt*, *vi* здавацца, выглядаць
seminare *vt* сеяць; *пер*. распаўсюджваць, сеяць
semmai *avv* хіба толькі
sèmplice *agg* просты
semplicità *f* прастата, нескладанасць
semplificare *vt* спрашчаць
semplificazione *f* спрошчанне
sempre *1avv* заўсёды, стала; той жа/тая ж; зноў жа; ***da s***. зноў жа; спрадвеку; ***s. più*** усё болей; ***per s***. назаўсёды; *2cong* ***s. che*** кожны раз як, пры ўмове, што
sennò *cong* у іншым разе; за выняткам
seno *m* цыцкі; улонне, нетры; сінус
sensazione *f* адчуванне
sensìbile *agg* чуйны, адчувальны
senso *m* сэнс, значэнне; пачуццё; прытомнасць
sentenza *f* прысуд
sentiero *m* сьцяжынка, дарожка
sentimento *m* пачуццё, адчуванне
sentire *vt* пачуць, адчуць; слухаць; ***sentite!*** слухайце!; ***s.rsi*** пачувацца; ***s.rsi a casa sua*** пачувацца як дома
senza *prep* без; ***senz`altro*** адразу ж
separare *vt* аддзяляць; ***s.rsi da*** расставацца, разыходзіцца
separatamente *avv* асобна
separato *agg* асобны, аддзелены
separazione *f* раздзяленне, аддзяленне; расстанне
***sepellire** (-sc-) *vt* хаваць /*нябожчыка*/
sepellito, sepolto *agg* пахаваны
seppure *cong* калі, нават, хоць бы і
sequoia *f* секвоя
sera *f* вечар (*час сутак*)
serata *f* вечар (*як мера часу*); вечарына
serbatoio *m* бак; басейн; вадасховішча
serenità *f* спакой, цішыня; яснасць
sereno *agg* ясны, ціхі; спакойны
seriamente *avv* сур'ёзна
serie *f* серыя, шэраг
serio *agg* сур'ёзны
serpente *m* зьмяя
serratura *f* замок
servire *1vt* служыць; прыносіць карысць; падаваць (*страву*; ***non s. a niente*** не мець значэння, быць марным; ***non serve!*** марна! не трэба!; *2vi* служыць; прыдацца; ***s. a poco*** быць мала прыдатным
servitore *m* слуга
servizio *m* служба; паслуга; перадача, рэпартаж
sessanta *num card* шэсцьдзесят
sesso *m* пол; секс
sessuale *agg* полавы; сексуальны
sesto *num ord* шосты
seta *f* шоўк
sete *f* смага; ***avere s***. смагнуць, хацець піць
setta *f* секта
settanta *num card* семдзесят
sette *num card* сем; сёмы
settecento *num card* семсот
settembre *m* верасень
settimana *f* тыдзень
settimanale *agg* тыднёвы; штотыднёвы
séttimo *num ord* сёмы
settore *m* сектар
severo *agg* строгі
sfamare *vt* накарміць
sfaticato *agg* лены, лянівы
sfavillante *agg* зіхоткі, бліскучы
sfavorèvole *agg* неспрыяльны
sfida *f* выклік
sfidare *vt* выклікаць, рабіць выклік
sfilata *f* шэраг
sfinimento *m* зьнямога, стома
sfiorare *vt* закранаць, чапаць
sfogare *1vt* даваць выйсьце, выліваць (*пачуцці*); *2vi* выходзіць (*дым*); выліваецца (*пра пачуцці*); ***s.rsi*** выгаварыцца, выліць душу
sfogliare *vt* абрываць лісьце; гартаць (*старонкі*)
sfogo *m* адтуліна; выхад (*пачуццям*)

sfollamento *m* разгон (*натоўпу*); эвакуацыя
sfollare *1vi* разыходзіцца (*натоўп*); вызваляцца (*памяшканне*); *2vt* разганяць (*натоўп*); эвакуяваць
sfondare *vt* прабіваць, выбіваць, узламаць
sfortuna *f* няўдача, няшчасьце
sfortunato *agg* няўдалы, няшчасны
sforzarsi сіліцца, намагацца
sforzo *m* намаганне, напружанне
sfrenato *agg* расцугляны, разбэшчаны; нястрымны
sfruttamento *m* эксплуатацыя; выкарыстанне
sfruttare *vt* выкарыстоўваць, эксплуатаваць
sfuggire *1vt* пазьбягаць, ратавацца, уцякаць; вылецець (*пра мяч*); *2vi* ухіляцца, выкручвацца; ***non vi sono sfuggiti*** ад вас не схаваешся
sfumare *1vi* дыміць; рассейвацца; *2vt* паступова зьніжаць інтэнсіўнасць
sfumato *agg* мяккі, неакрэсьлены
sgabello *m* зэдлік, лавачка, услончык
sgargiante *agg* яркі, які кідаецца ў вочы
sgombrare *vt* вызваляць, ачышчаць
sgominare *vt* рассеяць, разладзіць
sgonfiare *1vt* выпускаць (*паветра, газ*); *2vt* спадаць (*пухліна*)
sgrammaticato *agg* непісьменны, бязграматны
sgridare *vt* лаяць, сварыцца
sguardo *m* позірк, погляд; ***sotto s. attento di*** пад *чыім-н*. пільным позіркам
si I *pron riflessivo* сябе
si II *avv* так, такім чынам
sì *particella* так, але, ага
sia *cong* ці, ці то; ***s***... ***s***... ці… ці…
sibillino *agg* загадкавы, таямнічы
sicchè *cong* так, што; таму, такім чынам
siccità *f* засуха
siccome *cong* таму што, бо
siciliano *agg* сіцылійскі
sicurezza *f* упэўненасць; цьвёрдасць; бясьпека; ***in s.*** у бясьпецы; ***sistema di s. a prova di ladri*** сістэма бясьпекі ад зладзеяў
sicuro *agg* упэўнены, цьвёрды; надзейны; ***dare per s***. лічыць гарантаваным, гарантаваць; ***èssere s. di*** быць упэўненым у
sidecar *m* люлька (*матацыкла*)
siepe *f* плот, загарадзь
sigaretta *f* цыгарэта
siglare *vt* падпісваць, ухваляць
siglato *agg* падпісаны
significare *vt* значыць, азначаць
signora *f* спадарыня, пані, сіньёра
signore *m* спадар, пан, сіньёр
signorina *f* паненка, сіньярына
sii *гл*. èssere; будзь
silenzio *m* цішыня; маўчанне
silenzioso *agg* маўклівы; ціхі, спакойны
sìllaba *f* склад (*слова*)
sìmile *agg* падобны, аднолькавы
simpàtico (*pl* -ci) *agg* сімпатычны, прыемны
simultàneo *agg* адначасны
sin, (*гл*. **sino)** *prep*: ***sin da*** = fin da з, ад (*пра час*)
sinceramente *avv* шчыра
sincerità *f* шчырасць, адкрытасць
sincero *agg* шчыры, адкрыты
sindacato *m* прафсаюз
sindacale *agg* прафсаюзны
sìndaco (*pl* -ci) *m* бурмістр
singhiozzare *vi* галасіць
singolare *1agg* адзіны, асаблівы; *2m грам*. адзіночны лік
sinistra *f* левая рука; левы бок; левыя (*палітычна*)
sinistro *1agg* левы; змрочны, злавесны; *2m* няшчасьце, бяда
sino *prep* да; ***s. a che*** пакуль; ***s. da*** ад, пачынаючы з
sintassi *f* сінтаксіс
sintetizzare *vt* сінтэтызаваць, падагульняць

sintonìa *f* настройка (*радыё*); ***èssere in s. con*** быць настроеным на (*станцыю*)
sipario *m* заслона
siringa *f* шпрыц
sistema *m* сістэма, лад, парадак
sistemare *vt* ладзіць, папраўляць; уладкаваць, пакласьці; ***s. il cravattino*** паправіць гальштук
sistemato *agg* уладкаваны, паладжаны; ***èssere s.*** быць упарадкаваным
sito *m* сайт
situato *agg* разьмешчаны
situazione *f* становішча, стан
slavo *1agg* славянскі; *2m* славянін
slegare *vt* разьвязваць, адвязваць; ***s.rsi da*** адвязацца ад
slitta *f* сані
slogatura *f* вывіх
smarrire (-sc-) *vt* губляць; ***s.rsi*** згубіцца, заблудзіцца
smarrito *agg* згублены; які заблудзіўся
smascherare *vt* зрываць маску, выкрываць
smeraldo *m* смарагд
smentire *vt* абвяргаць
smèttere** *vt* пераставаць, кідаць; ***s. con/ ***di*** + *inf* перастаць *што-н. рабіць*
smisurato *agg* бязьмежны, аграмадны, невымерны
smorfia *f* грымаса
snello *agg* зграбны, стройны; увішны
snodarsi віцца, віляць
sobbalzo *m* падскокванне
soccórrere *vt* дапамагаць
soccorso *m* дапамога; ***pronto s***. хуткая дапамога (*служба; машына* - ambulanza *f*)
sociale *agg* сацыяльны, грамадскі
socialista *1agg* сацыялістычны; *2m* сацыяліст
società *f* грамадства, таварыства; ***s. malavitosa*** злачынная супольнасць
socièvole *agg* гаваркі, які любіць грамаду
socio *m* сябар, кампаньён
sodalizio *m* суполка, асацыяцыя
***soddisfare** *vt* задавальняць, аддаваць належнае
soddisfatto *agg* задаволены
soddisfazione *f* задавальненне
sofferenza *f* пакута, мука; цярплівасць
sofferto *1agg* перажыты, выпакутаваны; *2pp да* soffrire
soffiare *vi* дзьмуць
sòffice *agg* мяккі, пульхны
soffitto *m* столь
soffrire *1vt* цярпець, пакутаваць; *2vi* мучыцца, хварэць
soggetto I *agg* залежны, падуладны
soggetto II *m* паддадзены
soggiorno *m* знаходжанне; ***permesso di s***. дазвол на жыхарства
***soggiùngere** *vt* дадаваць (*да сказанага*)
soglia *f* парог
sognare *vt*, *vi* сьніць, бачыць у сьне; марыць
sogno *m* сон, сьненне; мара
solamente *avv* толькі
solare *agg* сонечны
solcare *vt* наразаць барозны, рэзаць бараздамі; ***s. il mare*** плаваць па моры
solco *m* баразна, разора
soldataglia *f* салдатня
soldato *m* салдат
soldi *mpl* грошы; ***i s. non mi mancano!*** грошы ў мяне ёсць! ***baracchina di quattro s.!*** варты жалю курэнь!
sole *m* сонца; ***di s.*** Сонечны
solenne *agg* урачысты
solidarietà *f* салідарнасць
sòlido *agg* цьвёрды; трывалы, моцны
sòlito *agg* звычайны, звычны; ***come al s.*** як звычайна; ***di s***. звычайна; ***sei il s.!*** ты як заўсёды!
solitùdine *f* самота, адзінота
sollecitare *vt* паскараць; прыспешваць, падганяць; настойваць
solo *1agg* адзін, самотны, адзінокі; *2avv* толькі, ўсяго; ***da s.*** адзін; сам, самастойна; ***resti da s***. ты застаешся

адзін; ***non s. ... ma...*** не толькі.., але і…
soltanto *avv* толькі, усяго
soluzione *f* вырашэнне, выйсьце
somiglianza *f* падабенства
somigliare *vt*, *vi* /a/ быць падобным да, мець падабенства
somma *f* сума
***sommèrgere** *vt* апускаць у ваду, пакрываць вадою, заталяць
sommergìbile *m* падводны човен
sommerso *agg* затоплены, пакрыты вадою; *пер*. нябачны, прыхаваны; ***economìa s.a*** шэрая/ ценявая эканоміка (*непадкантрольная ўладзе і скарбу*)
sommo *1agg* найвышэйшы, найвялікшы; *2m* вяршыня, верх
sondaggio *m* зандаванне, прамацанне; ***condurre il s.*** праводзіць зандаванне
sonno *m* сон; ***ho s***. я хачу спаць
sono *1 а. адз. л. і 3 а. мн. л. ц. ч. да* èssere
sonoro *agg* гукавы; звонкі, гучны
sopportare *vt* падтрымаць
sopra *avv* над, па-над, зьверху
sopracciglio *m* брыво
sopratutto *avv* асабліва, найперш
soppravvivere *vi* выжыць, застацца жывым
soppressivo *agg* які душыць, які нішчыць, здушальны
soppresso *1agg* здушаны, ліквідаваны; *2pp да* sopprìmere
***sopprìmere** *vt* ухіляць, ліквідаваць
sopra *1avv* уверсе, наверсе, зьверху; наверх; *2prep* на, над; звыш, болей
sopraffazione *f* прыгнёт, уціск; ***s. dell'uomo sull'uomo*** уціск чалавека чалавекам
***sopraggiùngere** *1vi* раптоўна надыходзіць, неспадзявана здарацца; *2vt* даганяць
soprannominare *vt* празваць, даць мянушку
sopratutto *avv* асабліва, пераважна, галоўным чынам
sopravvalutare *vt* пераацэньваць, ацэньваць завысока
***sopravvenire** *vi* здарацца, адбывацца, нечакана зьяўляцца
sopruso *m* злоўжыванне, гвалт
sorcio *m* мыш
sordo *agg* глухі; таемны; невыразны
sorella *f* сястра
sorgente *f* крыніца
***sòrgere** *vi* уставаць, узьнімацца; бруіцца
sorpasso *m* абгон
***sorprèndere** *vt* (*як* pèndere) засьцігаць зьнянацку; здзіўляць, дзівіць
sorpresa *f* нечаканасць, сюрпрыз
sorrìdere *vi* усьміхацца
sorriso *1m* усьмешка; *2pp да* sorrìdere
sorso *m* глыток; ***fare un s***. адпіць
sorta *f* гатунак, якасць, род
sorte *f* лёс, доля
sorto *pp да* sorgere
sorvegliare *vt* назіраць, наглядаць
sorveglianza *f* нагляд, назіранне
sorvolare *vt* лётаць, аблятаць; лунаць
***sospèndere** *vt* (*як* pèndere) падвешваць, вешаць; прыпыняць, адкладаць
sospensione *f* падвешанне; адкладанне, прыпыненне
sospeso *1agg* падвешаны, вісячы; *2pp да* pèndere)
sospettare *vt* падазраваць, недавяраць
sospetto *m* падозранне
sospirare *vi* уздыхаць
sosta *f* прыпынак, перапынак; ***una auto in s***. аўтамбіль на стаянцы; ***divieto di s***. прыпынак забаронены
sostantivo *m грам*. назоўнік
sostanza *f* рэчыва; сутнасць, зьмест
***sostenere** *vt* (di) вытрымаць, перанесьці; сцьвярджаць; падтрымліваць
sostenitore *m* прыхільнік, абаронца
sostituire (-sc-) *vt* замяняць
sostituto *m* намесьнік
sotterràneo *1agg* пад'земны; *2m* скляпенне; ***nei s.i*** у лёхах, у сутарэнні

sottile *agg* тонкі; худы, кволы; слабы (*голас*); тонкі, дасьціпны
sotto *1avv* унізе, уніз; *2prep* пад; менш, каля; пры, пад час
sottochiave *avv* замкнёны; ***tenere s. per un po`*** патрымаць трошкі пад замком
sottofondo *m* фон /*музычны*/
sottolineare *vt* падрэсьліць
sottolineatura *f* падкрэсьленне
sottomarino *agg* падводны
***sottomèttere** *vt* падпарадкаваць; прапаноўваць на разгляд, падаваць
sottopassaggio *m* пад'земны пераход
sottoporre *vt* (*як* porre) падкладаць; падвяргаць; падпарадкоўваць; ***s. ad esami*** падвяргаць экзаменам; абсьледаваць (*хворага*)
sottoscrìvere *vt* падпісваць
sottoterra *1m inv* склеп; *2avv* пад зямлёю
sottotìtolo *m* субцітр
sottovalutare *vt* недаацэньваць
sottovoce *avv* ціхенька, напаўголаса
***sottrarre** (*як* trarre) *vt* адбіраць, забіраць; вызваляць, пазбаўляць /*чаго-н. непрыемнага*/; *мат*. аднімаць
souvenir *m* сувенір
sovente *avv* часта
sovrafollamento *m* перапоўненасць
sovrano *1agg* найвышэйшы; суверэнны; *2m* манарх
sovversivo *agg* падрыўны; бунтоўны
spaccare *vt* калоць, сячы
spaccato *agg* расколаты, рассечаны, разьбіты; заўзяты
spaccatura *f* трэшчына, шчыліна; ***s. insanàbile*** незагойная рана
spacciatore *m* распаўсюднік; прадавец; ***s. di droghe*** гандляр наркотыкамі, прадавец наркотыкаў
spada *f* меч
spalancare *vt* расчыніць, шырока адчыніць
spalla *f* сьпіна; плячо; ***lasciare alle s***. пакінуць ззаду; ***trasportare a s.e*** пераносіць на плячах
sparare *vt* страляць; ***s. i razzi*** выпускаць ракеты
***spàrgere** *vt* рассыпаць, раскідаць разьліваць
sparire (-sc-) *vi* (da) зьнікаць, прападаць; ***sparisci !*** зьнікні!
sparo *m* стрэл
sparso *1agg* рассыпаны, раскіданы; пакрыты; *2pp да* spàrgere
spartiacque *m invar* водападзел; *пер*. вяха, этап
spartire *vt* дзяліць, падзяляць
spaventare *vt* палохаць, страшыць; ***s.rsi*** палохацца
spaventato *agg* палоханы, спужаны
spavento *m* жах, страх
spaventoso *agg* страшны, жахлівы
spaziale *agg* прасторавы; касьмічны; ***nave s***. касьмічны карабель
spazio *m* прастора; месца; інтэрвал; ***lo s. proprio*** уласная прастора
spazzatura *f* сьмецце
spazzino *m* падмятальшчык, дворнік
spazzolino *m* зубная шчотка
specchiarsi адлюстроўвацца, адбівацца; глядзецца ў люстэрка
specchio *m* люстэрка
speciale *agg* адмысловы, сьпецыяльны
specialità *f* спецыяльнасць
specializzato *agg* спецыялізаваны
specialmente *avv* асабліва
specie *1 f invar* від; ***s. protette*** ахоўныя віды; ***che s. di*** што за; якога кшталту; *2avv* асабліва
spedire (-sc-) *vt* адпраўляць, пасылаць
spedizione *f* адсылка, адпраўка; экспедыцыя; паход
spègnere** *vt* тушыць, выключаць; ***spegno il fuoco я патушу агонь; ***s.rsi*** прапасьці
***spèndere** *vt* траціць, выдаткоўваць
spennare *vt* скубці (*птушку*)
spensierato *agg* легкадумны, бесклапотны, бяздумны
spento *1agg* патухлы, патушаны; нядзейны (*вулкан*); *2pp да* spègnere

speranza *f* надзея, спадзяванне; ***nella s. che*** спадзеючыся, што
sperare *1vt* спадзявацца, чакаць; *2vi* спадзявацца на; ***spero non si tratta di.***.. спадзяюся, не трэба будзе...
sperimentare *vt* паспрабаваць, пакаштаваць
spesa *f* выдатак, затрата; ***fare la s***. рабіць пакупкі, ісьці ў краму
speso *1agg* патрачаны, зрасходаваны**;** *2pp да* spèndere
spesso *1agg* таўсты; густы, шчыльны; *2avv* часта; ***più s.*** часьцей
spessore *m* таўшчыня; шяыльнасць
spettàcolo *m* відовішча; сьпектакль; ***s. sportivo*** спартыўнае відовішча
spettare *vi* належаць, вынікаць
spettatore *m* глядач
spettatrice *f* глядачка
spettro *m* сьпектр; здань, прывід
spia *f* шпег, шпіён; сігнальная лямпачка
spiacere** *vi* не падабацца; ***mi spiace мне шкада
spiacèvole *agg* непрыемны
spiaggia *f* пляж, узьбярэжжа
spiare *vt* цікаваць, шпіёніць; сачыць
spiazzo *m* паляна; пляцоўка
spiccato *agg* прыкметны, буйны
spìccioli *mpl* дробязь, дробныя грошы
spiegare *vt* тлумачыць; разгарнуць; ***a sirene spiegate*** з уключанымі на ўсю моц сірэнамі
spietato *agg* бязьлітасны, няміласэрны
spìngere** *vt* штурхаць; змушаць, даводзіць; ціснуць; ***s. sul pedale del gas націскаць на/ педаль газу; ***s. giù in*** скінуць у
spinotto *m* шпень, палец (*тэхнічны*)
spinta *f* штуршок, імпульс; стымул, дапамога, падтрымка; ***sotto la s. di*** з-за, пад уплывам, пад узьдзеяннем
spinto *1 agg* рызыкоўны; ***s. da*** змушаны, прыціснуты (*чым-н.*); *2pp да* spìngere
spionaggio *m* шпіянаж; ***sospettare di s.*** падазраваць у шпіянажы
spirare *vi* дзьмуць, веяць; зыходзіць /*пах*/; канчацца /*тэрмін*/
spirìto *m* дух, розум; сутнасць
splèndere *vi* блішчаць, ззяць
splendido *agg* выдатны, бліскучы
spoglia *f* покрыва, абалонка***; sotto mentite s.e*** пад чужым імем
spogliare *vt* распранаць, здымаць вопратку; ***s.rsi*** распранацца
spolverare *vt* выціраць, выбіваць пыл; ***s. la strada*** месьці вуліцу
sponda *f* бераг; край, борт; схіл; ***s.e abbassate*** адкінутыя барты (*кузава*)
sponsorizzare *vt* фундаваць, даваць грошы на
spopolare *vt* абязьлюдзіць; ***s.rsi*** абязлюдзець
sporcare *vt* пэцкаць, брудзіць; ***s.rsi*** пэцкацца
sporco *agg* брудны; ***s. di vernice*** запэцканы ў фарбу; ***lo s***. бруд
spórgere** *vt* (*як* pòrgere) высоўваць, выстаўляць; ***s.rsi высоўвацца
sportello *m* акенца (*касы і пад.*)
sportivo *1m* спартовец; *2agg* спартыўны; ***spettàcolo s.*** спартыўнае відовішча
sporto *pp да* spòrgere
sposare *vt* жаніць, аддаваць замуж; ***s.***, ***s.rsi*** жаніцца, ісьці замуж
sposo *m* жаніх; ***gli sposi*** маладыя
spostamento *m* зрух, перастаноўка
spostarsi скрануцца, паварушыцца; перавозіцца, транспартавацца; перамяшчацца
spot *m* кліп; ***s. televisivi*** тэлевізійныя кліпы
sprangare *vt* зачыніць на засаўку; ***s. la finestra*** шчыльна зачыніць акно
sprèmere *vt* выціскаць; вымагаць
sprezzante *agg* пагардлівы
spuma *f* пена
spumante *m* шыпучае віно, “шампанскае”

spuntino *m* перакуска; ***niente s. della buonanotte per oggi*** ні кавалачка хлеба на вячэру сёння
sputare *vi* пляваць, пляваццa
squadra *f* брыгада; каманда; навугольнік
squàllido *agg* мізэрны, убогі; змарнелы
squalo *m* акула
squillare *vi* зьвінець; ***il telèfono squillò*** зазьвінеў тэлефон
squisito *agg* вытанчаны, далікатны
sradicare *vt* выкараніць, выкарчаваць
stabilimento *m* установа, прадпрыемства
stabilire (-sc-) *vt* вызначыць, устанавіць
staccare *1vt* аддзяляць, адрываць; *2vi*, ***s.rsi*** адрывацца, аддзяляцца
stadio *m* стадыён; ***allo s***. на стадыёне
stagione *f* пара году, сезон
stagno I *m* цына (*метал St*)
stagno II *m* копанка, сажалка
stalagmite *f* сталагміт
stalattite *f* сталактыт
stalla *f* стайня, хлеў; ***le s.e*** хлявы
stalliere *m* конюх
stallo *m* месца, крэсла /*дэпутата*/; шах /*у шахматах*/; ***la situazione di s.*** небясьпечнае становішча
stamattina *f* сёння раніцаю/ зранку
stambecco *m* горны казёл
stampa *f* друк, прэса
stampare *vt* друкаваць
stancare *vt* стамляць, надакучваць
stanchezza *f* стома, стомленасць; ***che s.!*** як я стаміўся/ стамілася!
stanco *agg* стомлены, зьнясілены; раздражнёны
stanotte *avv* сёння ўначы, сёння ноччу
stanza *f* пакой; палата /*бальнічная*/
stare** *vi* (sto, stai, sta, stiamo, state, stanno) стаяць, быць, знаходзіцца; доўжыцца; ***s. per + *inf* зьбірацца *што-н.* зрабіць; ***io non ci sono mai stata*** я там ніколі не была; ***ben ti sta, zio*** так табе і трэба!
stasera *avv* сёння ўвечары/ вечарам
statale *agg* дзяржаўны
statista *m* дзяржаўны дзеяч
stato *m* дзяржава; статус, стан
statuetta *f* статуэтка
statunitense *agg* амерыканскі, з ЗША
statura *f* рост; ***pìccolo di s.*** малога росту
stavolta *avv* гэтым разам
stazione *f* станцыя, вакзал
stecchino *m* зубачыстка
stella *f прам*., *пер*. зорка; ***salire alle s.e*** узьняцца да неба (*пра цэны*)
stemma *m* герб
stèndere** *vt* рассьцілаць, раскладаць; разьвешваць (*бялізну*); ***s.rsi прылегчы
stendibiancherìa *m invar* вешалка для бялізны (*каб сушыць*)
stentare *1vi* цярпець нястачу, жыць у галечы; *2vt* рабіць *што-н*. з цяжкасьцю
stento *1agg* бедны, убогі; *2m* галеча, нястача; ***a s***. з цяжкасьцю
stèreo *agg* стэрэа; ***lo s.*** плэер
sterile *agg* стэрыльны, бясплодны; *пер*. пусты, марны; ***s.i polèmiche*** беззьмястоўныя спрэчкі
sterminare *vt* зьнішчыць, вынішчыць
steso *1agg* разьвешаны, разасланы; ляжачы; *2pp да* stèndere
stesso *1agg* такі ж, аднолькавы; сам; *2m* тое ж самае, адно і тое ж
stima *f* павага
stimolare *vt* стымуляваць, заахвочваць
stipendio *m* заробак
stirare *vt* выцягваць, расьцягваць; прасаваць; ***s.rsi*** пацягвацца
stiva *f* трум /*карабля*/
stivale *m* бот, чобат
stolto *agg* дурны, тупы
stomachèvole *agg* агідны, невыносны
stòmaco (*pl* -chi, -ci) *m* страўнік; *пер*. сьмеласць
***stòrcere** *vt* скрывіць; вывіхнуць; скажаць, перакручваць

storia *f* гісторыя, падзея
stòrico (*pl* -ci) *1agg* гістарычны; *2m* гісторык
stormo *m* натоўп, тлум
strabiliante *agg* дзівосны, страшэнны
stracolmo *agg* паўнюткі, поўны як вока
strada *f* дарога, шлях, вуліца; ***andarsene per la sua s.*** пайсьці сваёй дарогаю; ***èssere sulla buona s.*** быць на правільным шляху
stradale *agg* вулічны, дарожны
straduccia *f* вулічка
strage *f* бойня, разьня
stragrande *agg* велізарны; ***s. maggioranza*** пераважная большасць
stramazzare *1vt* шпурляць на зямлю; *2vi* грымнуцца
strangolare *vt* душыць
straniero *1agg* іньшаземны, чужаземны; *2m* іньшаземец, чужаземец
strano *agg* дзіўны, незвычайны
straordinario *agg* незвычайны, надзвычайны; ***viaggio s.*** незабыўнае падарожжа
strappare *vt* торгаць, тузаць; ірваць, вырываць, зрываць
strappo *m* вырыванне, разрыванне
***stravòlgere** *vt* перавярнуць, вывернуць; перакруціць, пераіначыць
stravolto *1agg* перайначаны; перавернуты; узрушаны; *2pp да* stravòlgere
strega *f* варажбітка, вядзьмарка; чароўная жанчына
stregare *vt* завараражыць, зачараваць
stregone *m* чарадзей, вядзьмар
stremato *agg* зьнясілены, стомлены змораны
strepitoso *agg* шумны, гучны
stretto 1*agg* вузкі, цесны; пільны; *2m* пратока; цясьніна; *3pp да* stringere
strìngere** *vt* сьціскаць, прыціскаць; змушаць; ***s.rsi la mano паціскаць руку
striscia *f* палоса, палоска
strofinare *vt* церці, шараваць, націраць
strumento *m* прылада, апарат; ***s. musicale*** музычны інструмент
struttura *f* будова, структура
studente *m* студэнт
studentessa *f* студэнтка
studiare *vt* вывучаць, вучыць; дасьледаваць
studio *m* вывучэнне, дасьледванне
stufo *agg* абрыдлы, сыты
stupidàggine *f* бязглузьдзіца, тупасць
stùpido *agg* дурны, бязглузды, тупы
stupifacente *m* наркотык
stupire (-sc-) *vt* зьдзіўляць, уражваць
stupore *m* зьдзіўленне; ***con suo grande s.*** да свайго вялікага зьдзіўлення
su *1avv* наверсе, наверх; *2prep* па, на, над, у; пра, на; прыблізна, каля
sua *pron. poss. sing f* ейны, яе, свая
subire (-sc-) *vt* зносіць, цярпець, трываць; ***s. danni*** панесьці страты
sùbito *1agg* нечаканы, неспадзяваны; *2avv* зараз, адразу ж, неадкладна; ***non potevi dirlo s.?*** ты не мог сказаць гэта адразу?
***succédere** *vi* адбывацца, надарацца; быць (*за чым-, кім-н.),* займаць (*чыю-н. пасаду*)
successivo *agg* наступны
successo *1m* падзея, здарэнне; посьпех; *2pp да* succédere
succo *m* сок
sud *m* поўдзень; ***sud est*** паўднёвы усход; ***sud ovest*** паўднёвы захад
sudare *vi* пацець
suddivìdere** *vt* падзяляць, разьдзяляць; ***s. per categoria падзяляць на катэгорыі
sùdicio *agg* брудны, запэцканы; непрыстойны
sudore *m* пот
sue *pron. poss fpl* свае, іхнія
sufficiente *agg* дастатковы, здавальняючы; ***èssere più che s***. быць

больш чым дастатковым; ***s.i prove*** дастатковыя доказы
suffisso *m* суфікс
suggerimento *m* падказка; парада, прапанова
suggerire (-sc-) *vt* падказваць, нагадваць
suggestivo *agg* чароўны, хвалюючы
sugli = su + gli
sugo *m* сок; соўс
sui = su + i
suicidarsi пазбаўляць сябе жыцця, канчаць жыццё самагубствам
suicidio *m* самагубства
sul = su + il
**sull`** = su + l`
sulla = su + la
sullo = su + lo
suo *agg poss*. яго, ягоны, свой
suòcera *f* цешча; сьвякруха
suòcero *m* цесць; свёкар
suoi *pron poss. mpl* ягоныя, свае
suolo *m* зямля, глеба, грунт; пласт
suonare *vt*, *vi* званіць; іграць; гучаць; ***s. alla porta*** званіць у дзьверы
suono *m* гук, гучанне; ***l`acca non ha s.*** літара *«h»* не вымаўляецца
superare *vt* пераадолець, перамагчы; перавышаць
superbo *agg* ганарлівы, фанабэрысты
superficiale *agg* павярхоўны, вонкавы; *пер*. неглыбокі, павярхоўны
superficie *f* паверхня
superiore *1agg* верхні, большы, лепшы; старшы, вышэйпасадны; *2m* начальнік
superiorità *f* перавага, панаванне
superlativo *m* найвышэйшая ступень
supermercato *m* супермаркет
sùpplica *f* просьба, мальба
supplicare *vt* прасіць, маліць, упрошваць
***supporre** *vt* меркаваць, дапускаць, лічыць
supremo *agg* вярхоўны, найвышэйшы
suscettìbile *agg* уражлівы; які дапускае
suscitare *vt* выклікаць, спараджаць, ствараць
susseguire *vi* ісьці за (*адзін за адным*)
svago *m* весялосць, пацеха; задавальненне
svanire (sc) *vt* зьнікаць, прападаць; рассейвацца
sveglia *f* абуджэнне; будзільнік
svegliare *vt* будзіць; абуджаць; ***s.rsi*** прачынацца
sveglio *agg* які не сьпіць; жывы, бадзёры; ***ti sei s.a?*** ты прачнулася?
svelare *vt* здымаць покрыва; выкрываць
svelto *1agg* спрытны, увішны; зграбны; *2avv* хуценька, спрытна
svenire *vi* абамлець
sventato *agg* выкрыты, раскрыты
sventolare *1vt* махаць; *2vi* лунаць (*сьцяг*)
sventura *f* няшчасьце, бяда
svestire *vt* распранаць; ***s.rsi*** распранацца
svettare *vt* абразаць шчыкі /*дрэў*/
sviluppare *vt* разьвіваць; разблытваць
sviluppo *m* разьвіццё, рост; хада /*падзей*/
svìzzero *1agg* швейцарскі; *2m* швейцарац
svòlgere** *vt* разгортваць; праводзіць, ажыццяўляць; s. il suo lavoro*** праводзіць сваю працу/ ажыццяўляць сваю дзейнасць; ***s. una funzione di*** выконваць *якую-н*. функцыю; ***s. còmpiti*** выконваць хатнія заданні; ***s.rsi*** праходзіць, адбывацца
svolgimento *m* ажыццяўленне, рэалізацыя
svolta *f* паварот, рог (*вуліцы*)
svolto *1agg* праведзены**,** ажыццёўлены; 2*pp да* svòlgere

t T

tacco *m* абцас
taccuino *m* нататнік, запісная кніжка
tacco (*pl* -chi) *m* абцас

***tacere** *vi* маўчаць
taglia *f* рост; ***èssere di t. media*** быць сярэдняга росту
tagliando *m* купон; талон
tagliare *vt* рэзаць, разразаць; наразаць; ***t. la legna nel bosco*** сячы, рэзаць дровы ў лесе
tale *1agg* такі, падобны; *2pron dimostr* нехта
talmente *avv* настолькі, гэтак; ***t.bello che*** такі прыгожы, што; ***èssere t. infuriato*** быць настолькі раззлаваным
talpa *f* крот; таемны агент
taluno *1agg* некаторы; *2pron* нехта, хтосьці; (*pl* taluni) нейкія, пэўныя
talvolta *avv* часам, іншым разам
tamburo *m* барабан
tana *f* нара, бярлог, лагво
tanaglia *f* абцугі, шчыпцы
tangente *1agg* датычны; *2f* датычная; тангенс
tanto *1agg* вялікі, значны; ***mi piace tantìssimo*** мне гэтак падабаецца; *2pron dimostr*. шмат хто, гэта; *3avv* вельмі, столькі, надта; ***t. che*** пакольку; ***è t.i altri*** і шмат хто яшчэ; ***t. .. quanto...*** гэткі ж… як і…
tantomeno *avv* тым менш; ***ni t***. ні тым болей
tappa *f* этап; прыпынак
tappare *vt* затыкаць, закубрыць; ***t.rsi il naso*** заткнуць/ заціскаць нос
tappetto *m* дыван; абрус; ***bombardamento a t***. дывановае бамбардаванне, бамбардаванне плошчамі
tappo *m* корак, заткала
tardare *1vi* забаўляцца, пазьніцца; *2vt* затрымліваць
tardi *avv* позна; ***più t***. пазьней; ***si è fatto t***. ужо позна
targa *f* тарча, шчыт; нумарны знак
targata *f* нумарны знак (*аўтамабіля*)
tariffa *f* тарыф, расцэнка
tartaruga *f* чарапаха
tasca *f* кішэнь
tassa *f* (su) падатак; такса, плата
tassi *m* таксі
tastiera *f* клавіятура
tasto *m* дотык; мацанне; клавіш; ***bàttere il t. giusto*** закрануць адчувальную струнку, закрануць за жывое
tatuaggio *m* татуіроўка
taverna *f* карчма
tàvola *f* стол; дошка; табліца
tazza *f* кубачак; келіх
te *pron* цябе
tè *m* гарбата, чай
teatrale *agg* тэатральны
teatro *m* тэатр
tècnica *f* тэхніка
tècnico (*pl* -ci) *1agg* тэхнічны; *2m* спецыяліст, тэхнік
tedesco *1agg* нямецкі; *2m* немец; нямецкая мова
tègola *f* чарапіца
tela *f* тканіна, палатно
telàio *m* кросны; каркас; ***lavorare al t***. сядзець за кроснамі, ткаць
telecomando *m* пульт дыстанцыйнага кіравання /*тэлевізарам*/
telefonare *vt* тэлефанаваць
telefonata *f* тэлефонны званок, тэлефанаванне; ***le t.e fioccano alla segreteria*** тэлефонныя званкі не змаўкаюць у сакратарыяце
telefonino *m* мабільны тэлефон; ***chiamare con il t***. званіць па мабільным тэлефоне
telèfono *m* тэлефон
televisione *f* тэлевізія, тэлебачанне
televisivo *agg* тэлевізійны
televisore *m* тэлевізар
telo *m* палатно; шырыня (*тканіны*)
tema *m* тэма; корань, аснова (*слова*)
temere *vi* баяцца; сумнявацца
temperatura *f* тэмпература
tempesta *f* навальніца; бура, шторм
tempia *f* скроня
tempio *m* храм
tempo *m* час; надвор'е; тэмп; ***da t***. даўно; ***in t.*** у час, своечасова; ***èssere sempre in t. a farlo*** заўсёды пасьпець зрабіць *што-н.*; ***in breve t***. неўзабаве

temporale *1agg* часовы, мінучы; *2m* непагадзь, навальніца
temutissimo *agg* грозны
temuto *agg* пагрозьлівы, застрашальны
tenace *agg* упарты, цягавіты, несаступлівы; вязкі, клейкі; трывалы, моцны
tenaglia *f* = tanaglia
tenda *f* палатка
tendenza *f* тэндэнцыя, цяга, імкненне; ***assecondare la t***. падтрымліваць тэндэнцыю
***tèndere** *vt* цягнуць, нацягваць; развешваць
tendenza *f* тэндэнцыя; схільнасць
tendenzialmente *avv* пераважна, больш-менш
tendòpoli *f invar* палаткавы пасёлак; ***tirare una t.*** усталяваць палаткавы пасёлак
tenebroso *agg* цёмны; загадкавы, змрочны
tenente *m* лейтэнант; ***t. d'esèrcito*** вайсковы лейтэнант
tenere** *1vt* трымаць, утрымліваць; ***t. in ordine трымаць у парадку; *2vi* трымаць, трымацца; ***tieni forte!*** трымайся мацней!; ***tieni un attimo il../la..!*** патрымай хвілінку...! ***t.rsi*** трымацца, стрымлівацца; лічыць сябе
tènero *agg* мяккі, пяшчотны
tennis *m* тэніс
tensione *f* напруга, напятасць
tentare *vt* (di) спрабаваць, правяраць; спакушаць
tentativo *m* спроба; ***t. fallito*** няўдалая спроба
tentazione *f* спакуса; ***resìstere alla t.*** супраціўляцца спакусе
tènue *agg* малы, слабы; нязначны, дробны
teorìa *f* тэорыя
tergicristallo *m* шыбаачышчальнік (*аўтамабіля*)
terminare *1vt* канчаць; *2vi* канчацца
tèrmine *m* мяжа, край; тэрмін; слова; ***portare a t***. ажыццявіць, зьдзейсьніць
terra *f* зямля; глеба; зямны шар
terremoto *m* землятрус
terreno *m* глеба, зямля; сухазем'е; мясцовасць; ***preparare il t***. *прам., пер.* падрыхтаваць глебу
terestre *agg* зямны; наземны
terrìbile *agg* жахлівы, жудасны, страшны
terribilmente *avv* страшэнна; ***t. amaro*** страшэнна горкі
terrificante *agg* жахлівы, страшны
terrore *m* жах; тэрор
terrorismo *m* тэрарызм
terrorista *m* тэрарыст
terrorizzare *vt* тэрарызаваць
terzo *num ord* трэці
tesi *f* тэза, канцэпцыя; дысертацыя
tesoriere *m* скарбнік
tesoro *m* скарб
teschio *m* чэрап
tèssera *f* білет (*членскі*); прадуктовая картка
tessuto *m* тканіна; *біял*. тканка
testa *f* галава, розум; галава, пярэдняя частка
testacoda *m invar* паварот на 180^0, паварот у супрацьлеглым накірунку; ***fare un t.*** зрабіць рэзкі разварот
testamento *m* тэстамент; запавет
testardo *agg* упарты; упарта
testata *f* край, перад; удар галавою
testimone *m* сьведка
testimoniare *vi* даваць паказанні, сьведчыць; ***t. contro di me*** даваць паказанні супраць мяне
testo *m* тэкст
testùggine *f* чарапаха
tetta *f* цыцка
tetto *m* дах, страха
tettònico (*pl* -ci) *agg* тэктанічны
ti *pron. pers*. табе, цябе
tièpido *agg* цёплы
tifare *vi* перажываць, хварэць (*за каманду*)
tifoso *m* заўзятар
timbro *m* штэмпель; тэмбр

timidezza *f* нясьмеласць, баязьлівасць
tìmido *agg* нясьмелы, сарамлівы
timone *m* стырно
timoniere *m* стырнавы
timore *m* страх, апасенне
***tìngere** *vt* фарбаваць
tìpico (*pl* -ci) *agg* тыповы
tipo *m* тып, від; узор, мадэль; ***èssere un t. tosto*** быць прайдзісьветам; ***un t. molto socievole*** вельмі гаваркі /прыязны чалавек
